КУЛЬТУРА

"ЗА ДУХОЎНАЕ АДРАДЖЭННЕ" АДУРЭАТ ПРЭМІІ

WWW.KIMPRESS.BY
ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА
1991 г. / № 4 (1339)
27 студзеня 2018 г.

Вымераць гармонію рэнтгенам

Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Фінальныя рэстаўрацыйныя работы на карціне Фірса Жураўлёва "Дзявочнік у лазні".

Калі ўпершыню трапляеш у рэстаўрацыйныя майстэрні Нацыянальнага мастацкага музея, не пакідае адчуванне, нібы ты ўвайшоў у лабараторыю шалёнага і геніяльнага прафесара з нейкага мультфільма або фэнтазі. Гэта адначасова і мастацкая студыя з карцінамі, развешанымі і раскладзенымі ўсюды, і навуковая бібліятэка, бо ўсе вольныя месцы запоўненыя кнігамі: ад выкшталцоных мастацкіх альбомаў да акадэмічных манаграфій па дакладных навуках. А таксама — набор дзіўных прыбораў, якія ўтвараюць сапраўдную біяхімічную лабараторыю. Не кажучы ўжо пра кабінеты з рэнтген-устаноўкай і камеры з іншым далікатным і "разумным" абсталяваннем. Нават цяжка падлічыць, колькі розных галін ведаў выкарыстоўвае ў наш век сучасная рэстаўрацыя!

Таму і нядзіўна, што Дзень беларускай навукі адзначаюць таксама і ў музейных сценах. А ў лабараторыях НДІ спецыялісты часам вырашаюць тыя праблемы, якія ўзнікаюць у гуманітарнай сферы. Гэтае супрацоўніцтва стала ўжо добрай традыцыяй, пра што сведчаць прымеркаваныя да свята матэрыялы нумара.

Працяг тэмы Дня беларускай навукі — **на старонках 3 — 7.**

Погляд з XXI стагоддзя

РЭЖЫСЁР З ЖАЛЕЗНАЙ ХВАТКАЙ

28 студзеня народнаму артысту СССР Міхаілу Пташуку споўнілася б 75 гадоў. Напярэдадні памятнай даты "К" перагледзела галоўныя стужкі майстра, каб "убачыць" іх з пазіцыі сённяшняга дня.

Ст. 14 — 15

Асоба

ІМПЭТ І МАГІЯ "СПРАВЫ МОЦНЫХ"

"Пладзіце зайздроснікаў! Яны не дадуць вам спачываць на лаўрах" – натхняльная гутарка з рэжысёрам Уладзімірам АРЛОВЫМ.

Ст. 13 — 14

Хлопцы з нашага двара

"Я АДКАЛОЎСЯ АД СВАЙГО ПАКАЛЕННЯ"

З'ехаўшы, куды прыйшоў Уладзімір КАЗЛОЎ, ад пісьменніка даведалася "К".

Ст. 12

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" ПРАЗ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ (63875) І ВЕДАМАСНЫ (638752) ІНДЭКСЫ.

З дапамогай банкаўскай карткі газету можна выпісаць праз інтэрнэт-сэрвіс на сайце "Белпошты" (пункт "Афармленне падпіскі на друкаваныя сродкі масавай інфармацыі").

9 771994 478007 18004

Наваполацк афіцыйна стаў культурнай сталіцай Беларусі-2018

Міністр культуры Юрый Бондар і старшыня Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрый Дзямідаў падчас урачыстай перадачы эстафеты культурнай сталіцы Беларусі ў Палацы культуры ААТ "Нафтан". Фота Аляксандра ХІТРОВА, БелТА.

Такі пачэсны статус розныя гарады краіны атрымліваюць з 2010 года. Першым быў Полацк, затым Гомель, Нясвіж, Магілёў, Гродна, Брэст, Маладзечна. Бабруйск 23 студзеня перадаў эстафету Наваполацку.

Ва ўрачыстай цырымоніі прыняў удзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Юрый Бондар. Ён уручыў старшыні Наваполацкага гарвыканкама Дзмітрыю Дзямдаву спецыяльны сертыфікат, каб дакументальна пацвердзіць новы статус горада на Дзвіне, які сёлета адзначыць 60-годдзе.

— Нягледзячы на малады ўзрост, Наваполацк — буйнейшы прамысловы цэнтр краіны, — падкрэсліў у сваёй прамове Юрый Бондар. — Горад не можа пахваліцца старажытнымі помнікамі, але тут створана багатая сацыяльна-культурная сфера. Няма сумневу, што ў Наваполацку будуць падтрыманыя і атрымаюць развіццё традыцыі рэспубліканскага праекта. Цягам гэтага года тут запланавана правядзенне больш як 200 мерапрыемстваў. Яны нададуць імпульс далейшаму развіццю горада.

Выставы, канцэрты, конкурсы прыгажосці, пленэры, тэатральныя гастролі, сустрэчы з творцамі — культурны каляндар-2018 абяцае жыхарам і гасцям Наваполацка насычаны год. Асноўныя святочныя мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею горада, адбудуцца ў чэрвені.

Хвіліна Памяці

26 студзеня, пятнаццаць гадоў таму, пайшоў з жыцця Уладзімір Георгіевіч Мулявін. Заўсёды ў гэты дзень на месца ягонага пахавання на Усходніх могілках прыходзяць з жывымі кветкамі людзі.

Гэта тыя, хто ведаў народнага артыста асабіста — сваякі, сябры і калегі. А таксама тыя, хто шануе творчасць "Песняроў". Для каго Мулявін — легенда беларускай музыкі і гонар краіны. Наш фотакарэспандэнт занаватаў адзін з эпізодаў ушанавання памяці славутага музыканта. Ля мемарыяла Песняра — аўтар надмагільнага помніка Аляксандр Каструкоў (справа), дзеці Уладзіміра Георгіевіча — Вольга і Валерый, супрацоўнікі Музея Мулявіна — Вольга Касцюковіч і Наталля Жарнак, а таксама супрацоўнік Цэнтра тэатральных ініцыятыў Ягор Міхалевіч.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ
Фота Паліны КАСМАЧОВАЙ

Адкрыццё "Буквара"

Першы ў свеце "Буквар" 400 гадоў таму выдалі з удзелам беларусаў. "К" даведалася, чаму на гэта звярнулі ўвагу толькі цяпер.

Ганна ШАРКО \
Фота аўтара

— Тры гады таму ў Лондане ў бібліятэцы Мідл Тэмпл я ўбачыў першую ў свеце кнігу, названую "Букваром", — распавёў "К" намеснік дырэктара па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Алесь Суша. — Яе выпусцілі ў беларускай друкарні ў 1618 годзе. У свеце захаваліся, на жаль, толькі два асобнікі — адзін у Лондане, другі і няпоўны ў Капенгагене ў Каралеўскай бібліятэцы.

Першы "Буквар" быў выдадзены 400 гадоў таму ў друкарні пры Віленскім Свята-Духавым праваслаўным брацтве ў Еўе — мястэчку, што належала князям Агінскім.

— На той час іх выдавецтва лічылася адным з самых уплывовых у Вялікім Княстве Літоўскім і друкавала выданні на старабеларускай, царкоўнаславянскай і польскай мовах, — адзначае дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Раман Матульскі.

— У далейшым першы "Буквар" фактычна паўтарыў Спірыдон Собаль — амаль з такой жа назваю, з падобным зместам выпусціў свой "Буквар" у 1634 годзе ў Куцейне, а потым у 1636 годзе ў Магілёве, — дадае Алесь Суша. — Сёння па кнізе з назвай, якую прыдумалі нашы продкі, вучацца ў многіх краінах свету.

Чаму ж на тэрыторыі Беларусі не захавалася ні аднаго асобніка? Па словах Рамана Матульскага, да вучэбных выданняў у той час ставіліся вельмі неасцярожна, таму яны часта губляліся. Тыя асобнікі, што ўдалося захаваць, магчыма, перавезлі ў Лондан імігранты, а потым выданні набылі калекцыянеры.

Азнаёміцца з электроннай версіяй "Буквара" можна на сайце брытанскай бібліятэкі www.middletemple.org.uk. Намеснік кіраўніка місіі Пасольства Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі ў Рэспубліцы Беларусь Іан Фокс распавёў, што арыгінал кнігі, хутчэй за ўсё, належаў заснавальніку бібліятэкі Роберту Эшлі — у яго калекцыі было каля 3700 кніг. Іан Фокс дадаў, што ў Мідл Тэмпл ёсць яшчэ адно больш позняе выданне "Буквара", аднак яно было надрукавана іншым станком у іншай друкарні.

Выданне пачалі даследаваць толькі ў апошнія гады. Даследчыкі высветлілі, хто мог уваходзіць у склад аўтараў кнігі. Існуе меркаванне, што адным з іх з'яўляецца пісьменнік Мялецій Сматрыцкі, ёсць там таксама і тэксты Лаўрэнція Зізанія.

— Прысутнасць гэтых двух аўтараў ужо дае нам права лічыць выданне беларускім, таму мы вырашылі, што варта звярнуць на гэта ўвагу ў 2018 годзе, — тлумачыць Раман Матульскі.

Вясной у Нацыянальнай бібліятэцы адкрыецца выстава букваро ў і іншых важных для беларускай гісторыі кніг. У красавіку ў Мінску адбудуцца кнігазнаўчыя чытанні "400-годдзе першага "Буквара", да якіх далучацца шмат гасцей з розных краін. Восенню бібліятэка плануе прэзентаваць шырокай публіцы выданне першага "Буквара", якое паспрабуюць прывезці з Вялікабрытаніі акурат да Дня ведаў.

Азнаёміцца з электроннай версіяй "Буквара" можна на сайце брытанскай бібліятэкі www.middletemple.org.uk.

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Ілья Васільевіч СВІРЫН; **намеснік галоўнага рэдактара** — Вераніка МОЛАКАВА; **адказны сакратар** — Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Генадзь СІВОХІН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ; **карэспандэнт** — Ганна ШАРКО; **фотакарэспандэнт** — Сяргей ЖДАНОВІЧ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Эрклямны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — СЛАБОДЗІЧ Ірына Аляксееўна;
першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна. Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2018.
Наклад 4 266. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 26.01.2018 у 18.00. Замова 58. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Знакамітая невядомая крэпасць

Вельмі часта ў нас навуку разумеюць выключна ў пазітывісцкім ключы — як даследаванні са складанымі тэхнічнымі прыстасаваннямі чагосьці канкрэтнага, што можна памацаць. У культуры, насамрэч, такое рэдкасць — магчыма, апрача рэстаўрацыі з яе рэнтгенамі і фізіка-хімічнымі аналізамі. Цудоўным прыкладам вельмі сур'ёзных, але зусім непазітывісцкіх навуковых даследаванняў можа стаць работа Фонду развіцця Брэсцкай крэпасці па вывучэнні спадчыны фартэцыі. Тым больш, што і плён працы яго каманды можна рэальна патрымаць у руках — днямі як раз адбылася прэзентацыя выдання "Атлас крэпасці Брэст-Літоўск "Том III. Фартовы перыяд", які і падсумаваў не адзін год напружанай работы даследчыкаў і грамадскіх актывістаў.

Генадзь ВОХІН

Як распавяла на прэзентацыі выдання дырэктар фонду Іна Прылежаева, атлас крэпасці Брэст-Літоўск "Том 3. Фартовы перыяд" з'яўляецца плёнам амаль трохгадовай працы міжнароднага калектыву даследчыкаў. Асноўнае пытанне, якое паўстала перад групай апантаных знакавым месцам у айчыннай гісторыі і дапамагло ім усім згуртавацца — захаванне і папулярызацыя брэсцкай спадчыны.

— Якія праекты нам дапамогуць захаваць спадчыну крэпасці? Як вакол іх аб'яднаць грамадскія рэсурсы? Такія пытанні паўсталі перад заснавальнікамі фонду яшчэ ў 2015 годзе, — патлумачыла дырэктар.

Шырокаму колу Брэсцкая крэпасць больш знаёмая па сумных падзеях часоў Другой сусветнай вайны, але мае яна слаўныя старонкі ў сваёй гісторыі і ў ранейшыя перыяды. І не толькі слаўныя — для яе стварэння, як вядома, расійскімі ўладамі быў знішчаны старажытны горад, на месцы якога і ўзведзены абарончы комплекс. Праявіў ён сябе і за часамі І Сусветнай вайны, важнае значэнне яму надавалася і ў міжваеннай Польшчы. Такім чынам, як заяўляюць арганізатары праекта, атлас зможа адказаць на цэлы шэраг пытанняў.

— Напрыклад, з якой мэтай фартэцыя пабудаваная? Больш за тое, — працягвае Іна Прылежаева, — у даследаванні таксама раскрытыя этапы яе гістарычнага існавання і прадэманстраваныя як зніклыя, так і захаваныя фрагменты крэпасці, распаведзена пра іх сённяшняе жыццё.

У выніку працы ў 2017 годзе быў падрыхтаваны і выдадзены даволі змястоўны фаліянт. Прычым вырашылі пачаць з канца і першым надрукавалі трэці том трохтомніка. Зрэшты, як мяркуецца, ён не стане апошнім, бо ў часе работы даследчыкі прыйшлі да разумення, што трыма кнігамі не абысціся і ўжо запланаваная чацвёртая.

Як патлумачыў навуковы кіраўнік даследчага праекта і адначасова — аўтар-укладальнік атласу Уладзімір Арлоў, эксперт фонду па гісторыка-культурных даследаваннях і кіраўнік фонду вайсковай спадчыны Літвы з горада Каўнаса, падчас правядзення навуковых вышукаў было прааналізавана блізу тысячы архіўных спраў па тэме ў архівах розных краін, у тым ліку значная частка іх — у не так даўно адкрытых для навукоўцаў ваенных архівах Расійскай Федэрацыі. Геаграфія даследавання сягнула ад суседняй Польшчы да далёкага Уладзівастоку.



Навуковы кансультант праекта загадчык філіяла "Музей V форт" Брэсцкай крэпасці Аляксандр Каркатадзэ адзначыў, што шмат якія з гэтых дакументаў да апошняга часу мелі грыф сакрэтнасці і былі недаступныя нават для даследчыкаў з самога музея Брэсцкай крэпасці. Дзякуючы выданню, тыя крыніцы былі не толькі ўведзеныя ў навуковы абарот, але і могуць цяпер паспрыяць далейшай музеефікацыі і самой крэпасці, і легчы ў аснову адукацыйнай работы, а таксама стаць чарговым штуршком у развіцці турыстычнага патэнцыялу рэгіёну.

Такім чынам, як быццам бы ўсім знаёмы помнік у выніку даследавання адкрыў свае новыя — раней невядомыя бакі. Зроблена гэта было ў прывабнай папулярнай форме прыгожа афармленага выдання, але пры гэтым — цалкам на грунце акадэмічных даследаванняў.

К

Страта

Культурны герой эпохі крыгаходу



24 студзеня пайшоў з жыцця Міхал Анемпадыстаў. Літаратар, чые радкі многія ведаюць на памяць. Дызайнер з уласным бачаннем стылю. Даследчык колераў і ментальнасці. І, бясспрэчна, культурны герой свайго часу.

Ілья СВІРЫН

Анемпадыстаў прыйшоў у мастацтва ў час крыгаходу — татальнай змены гістарычнай парадыгмы. Без сумневу, ён выразны прадстаўнік новага, ужо несавецкага пакалення творцаў. І менавіта дзякуючы яму (як і, напрыклад, Адаму Глобусу і Ігару Бабкову) адыход ад старога не стаў яго рашучым адпрэчваннем — прынамсі, у творчасці. У суседніх культурах у той час на арэну выходзілі трыбуны, здатныя прамаўляць ад імя мас. А ў нашай літаратуры — а ўслед за ёй і ў рок-музыцы — з'явіўся зусім іншы герой новага тыпу. Гараджанін з добра выяўленай індывідуальнасцю, эстэт з абвостранай пачуццёвасцю — і, зразумела, самотнік, які супрацьпастаўляе сябе натоўпу. Панеўрапейская касмапалітычнасць у ім неяк наздзіў арганічна спалучылася з нацыянальнай самаідэнтыфікацыяй.

Менавіта такі невыпраўляльны індывідуаліст мог зрабіць мінімалістычны дызайн культавых альбомаў першага складу Ulis і напісаць для "Новага неба" радкі пра бясконцае чаканне Калядаў і горад, які спакваля пагружаецца пад ваду.

І менавіта з гэтай сваёй "крыгі" Міхал Анемпадыстаў распачаў уласныя даследаванні архетыпаў нацыянальнай (пад)свядомасці. Спярша быў эпахальны для айчыннай музыкі "Народны альбом", прысвечаны "крэсовай" ментальнасці міжваеннага часу. А потым — грунтоўнае і зусім не бясспрэчнае праз сваю смеласць асэнсаванне колераў у культуры беларусаў (гл. "К" № 39 за 2017 год).

Якім мог бы стаць яго новы, "марскі" праект, мы напоўніцу так і не даведаемся. Наш журналіст Алег Клімаў меркаваў звязацца з Міхалам, каб пагаварыць на гэтую тэму, ды, на жаль…

Адпрыродная інтэлігентнасць Міхала не магла не ўражваць. Прысутнасць гэтай асобы ў нашым "культурным ландшафце" заўсёды была далікатнай. Ён ніколі не акцэнтаваў на сабе ўвагу. Ні з кім "на публіцы" не сварыўся. Не ствараў на пустым месцы медыянагодаў. Проста, рабіў справу. Тое, што ён сам лічыў патрэбным.

Але пры гэтым на пахаванне Анемпадыстава сабраліся сотні людзей. Тых, для каго ён стаў сапраўды блізкім — не толькі праз асабістыя стасункі, але і праз сваю творчасць.

К

Калектыў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь выказвае шчырыя спачуванні загадчыку аддзела старажытнабеларускага мастацтва Алене Уладзіленаўне Карпенка ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю бацькі.

Дзяжурны па нумары

У пошуках філасофскага каменя

Навука ўзнікла з пытання. Першым тэарэтыкам стаў, відаць, той жыхар першабытных пячор, які задумаўся: "Ці толькі ад маланкі бярэцца на зямлі агонь?" Тут галоўнае правільна пабудаваць пытанне. Першы практык заўважыў, што ад удару каменя аб камень высякаецца іскра, і распаліў вогнішча. Не выключана, што гэтым неўтаймоўным практыкам стаў дапытлівы цікаўны тэарэтык. А той, хто пахіснуўся і сеў на абвугленыя дровы, аўтаматычна пераўтварыўся ў першага філосафа. Першым заўжды няпроста.

Яўген РАГІН

Па гэтай "неандэртальскай" логіцы нескладана прасачыць, як узнік першы работнік культуры. Ён пачаў спяваць і скакаць ля тушы ўдала забітага маманта. Проста так, ад шырыні душы і па прычыне радаснага ўспрымання жыцця. Той, хто зрабіў заўвагі па ўдасканаленні танцаў і спеваў, імкліва пераўтварыўся ў метадыста — спецыяліста па прапанове канкрэтных метадаў для аптымальнага вырашэння задач. Методыка, як той філасофскі камень у сярэднявечных алхімікаў, пераўтварае шараговую з'яву пошуку ў золата творчага адкрыцця.

А прагрэсіўная методыка — заўжды праява перадавой навукі. Падаецца, гэта аксіёма. Але я не спяшаўся б даводзіць, што кожны крок нашай культуры — навукова вывераны ды падмацаваны ўзважанай сусветнай практыкай. У адваротным выпадку, як падаецца, тэрмін "эканоміка культуры" ў спалучэнні з прыметнікам "эфектыўная" не выклікаў бы ўсеагульнага непаразумення і нязменнай роспачы.

Калісьці нашы абласныя метадычныя цэнтры былі яшчэ і навуковымі. Я высветліў, як дзейнічаў механізм. Прадстаўнікі творчых навучальных устаноў пастаянна адсочвалі стан спраў рэгіянальнай культуры, давалі рэкамендацыі метадыстам, якія абавязкова ўлічвалі іх у паўсядзённай дзейнасці клубаў, бібліятэк, музеяў, дамоў рамёстваў... Жыццё ў эпоху ўсеагульнай аптымізацыі змянілася карэнным чынам. Цяпер наяўнасць навуковага складніку — абавязак не рэгіянальны, а сталічны. Не, двухбаковая сувязь паміж тэарэтыкамі і практыкамі захавалася. Але другія, у параўнанні з першымі, займелі больш ініцыятывы. А ці скарысталіся?

Памятаю, на пачатку кампаніі па асваенні планаў платных паслуг вобласці запрасілі да сябе спецыялістаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, якія прачыталі курс лекцый па азначанай тэме. І гэта наўпрост паўплывала на ход пазабюджэтнай дзейнасці. Аднак запрасілі да сябе вучоных толькі дзве вобласці з шасці.

Прыблізна тая ж сітуацыя паўтарылася і на Каліноўскага, 12 у Мінску, калі на курсы па фандрайзінгу са 118 раёнаў краіны прыехалі толькі недзе дзесяць чалавек. У іншых бракавала грошай на камандзіроўку. Для таго, каб навучыцца зарабляць, не стае грошай… Да мяне і па сёння звяртаюцца ў раёнах, каб займець нумары тэлефонаў тых грамадскіх суполак, якія наладжваюць кансультацыі ды трэнінгі па супрацоўніцтве з грантадаўчымі арганізацыямі і фондамі.

Летась я некалькі разоў на тыдзень наведваў кафедру менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКіМ. У выніку на старонках "К" з'явілася рубрыка "Лабараторыя", дзе гаворка ішла пра новыя тэхналогіі ў сферы культуры. Паверце, мне было вельмі цікава вучыцца і выкарыстоўваць новыя веды для стварэння тэкстаў, якія павінны былі хоць нейкім чынам дапамагчы тым, хто прыйшоў у культуру, не маючы спецыяльнай адукацыі. А такіх, як паказвае практыка, усё болей. Мэтавікі вучацца далей. Завочнікаў — мала з прычыны таго, што дасведчаных практыкаў амаль прыбрала пенсія. Так што ўчарашняя даярка ў якасці бібліятэкара — справа шараговая. Якую праграму набыцця хоць нейкай кваліфікацыі падрыхтавала для яе наша навука? Адказаць на гэтае пытанне амаль гэтак жа проста, як і філасофскі камень вынайсці.

К

Вымераць гармонію рэнтгенам

Адна з самых сур'ёзных праблем у музейнай сферы ўсяго свету амаль не заўважная для наведвальнікаў. Мы прызвычаіліся бачыць экспанаты ў найлепшым выглядзе, хаця ў сховішчы яны часцяком трапляюць зусім у іншай кандыцыі. Ды, на жаль, далёка не ў кожным музеі нават Мінска ёсць свае рэстаўратары — не кажучы ўжо пра невялікія рэгіянальныя. Як жа тады вырашыць гэтую праблему ў маштабе краіны?

Генадзь ВОХІН / Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

ДЫК ЦІ БЫЛІ ПТУШКІ?

Фармальна ў Беларусі музеі ў 2007 годзе страцілі статус навуковых устаноў, але ў аснове іх дзейнасці ляжыць менавіта навуковая работа, адным з галоўных кірункаў якой і з'яўляецца рэстаўрацыйны. Ён, у сваю чаргу, аб'ядноўвае дасягненні самых розных галін. Часам здараецца так, што менавіта метады дакладных навук ставяць кропку ў мастацтвазнаўчых дыскусіях. Прыкладам, даследчыкі доўга спрачаліся, ці былі жоравы ў першым варыянце карціны Івана Шышкіна "Балота. Жоравы", якая з'яўляецца ўласнасцю Нацыянальнага мастацкага. Даследаванні архіўных крыніц далі падставы меркаваць, што птушкі аўтарам былі дамаляваныя пазней, але канчаткова пацвердзіла гэтую тэорыю менавіта рэнтгенаграма.

А карціна Івана Шышкіна "Лес. Яліны" трапіла ў музей для правядзення экспертызы і выяўлення яе сапраўднасці ў рамках следства па адной крымінальнай справе. Супрацоўнікі правялі тады не толькі натурныя даследаванні, што ўключаюць візуальны агляд і параўнанне з іншымі работамі майстра, але рэнтгенныя і хімічныя даследаванні.

Як адзначыў намеснік гендырэктара НММ Сяргей Вечар, такая работа магчыма толькі таму, што музей забяспечаны і кваліфікаванымі кадрамі, і сучасным прафесійным абсталяваннем. Актыўна працуе сектар фізіка-хімічных даследаванняў — а выключна дзякуючы ім можна даведацца рэальны ўзрост мастацкага твора. Да таго ж, падтрымліваюцца шчыльныя партнёрскія стасункі як з айчыннымі, так і з замежнымі профільнымі ўстановамі. У прыватнасці, "К" ужо пісала пра мабільны лазерны эмісійны спектрометр — унікальны апарат для якаснага і колькаснага аналізу элементнага складу твораў мастацтва, распрацаваны ў Інстытуце фізікі НАН Беларусі (гл. № 43 за 2016 год).

Працэс навуковай рэстаўрацыі — з'ява вельмі дарагая, цяжкая і марудная. Нават час, які выдаткоўваецца на работу з музейным прадметам, можа быць вызначаны тэхнічным рэгламентам хіба што прыкладна і ўмоўна. Бо кожны артэфакт — унікальны і непаўторны. Адпаведна, унікальнымі і непаўторнымі з'яўляюцца і яго праблемы. У любы момант штосьці можа пайсці не так, запатрабаваўшы дадатковых даследаванняў альбо, напрыклад, тэрміновай камандзіроўкі да калегаў, каб яны падзяліліся досведам работы з яшчэ не апрабаванай тэхнікай.

Як патлумачыла загадчыца сектара рэстаўрацыі алейнага жывапісу НММ Святлана Дзікуць, у Беларусі вельмі не хапае музейных рэстаўратараў. У адпаведным аддзеле Нацыянальнага мастацкага працуе 25 чалавек. Здавалася б, нямала, але... Суразмоўца праводзіць паралелі з замежнай практыкай. У Вільнюсе існуюць два цэнтры музейнай рэстаўрацыі. Кожны абсталяваны паводле апошняга слова тэхнікі і, галоўнае, забяспечаны кваліфікаванымі кадрамі. У адным з іх, напрыклад, працуе блізу ста чалавек. І яны не сядзяць без справы. У Літве выбудаваная сістэма, дзякуючы якой музеі з розных куткоў краіны могуць аддаваць у гэтыя цэнтры на рэстаўрацыю не толькі бясцэнныя шэдэўры, але і шараговыя музейныя прадметы.

Святлана Дзікуць лічыць вартым пераймання і іншы досвед суседзяў. У вільнюскай Акадэміі мастацтваў студэнты апошніх курсаў маюць магчымасць прайсці спецыялізацыю ў рэстаўрацыйнай майстэрні, арганізаваную па прынцыпах медычнай інтэрнатуры, — і, дзякуючы ёй, на практыцы зразумець, што з сябе ўяўляе гэтая праца. У выніку ў прафесіі застаюцца тыя, каму сапраўды там месца.

— Рэстаўрацыя — гэта перадусім практыка, — дадае суразмоўца. — Ёй нельга навучыцца праз тэорыю: трэба практыкаваць і яшчэ раз практыкаваць.

Загадчыца сектара алейнага жывапісу навукова-рэстаўрацыйных майстэрняў НММ Святлана Дзікуць рыхтуе да юбілейнай выставы твор нашага класіка Леаніда Шчамялёва.

АДЗІН НА ЎСЮ ВОБЛАСЦЬ

У іншых музеях пра найноўшыя тэхналогіі на службе рэстаўрацыі казаць пакуль не выпадае — як, зрэшты, часцяком і пра саму рэстаўрацыю. Бывае, супрацоўнікі нават вымушаны адмаўляцца ад набыцця каштоўных прадметаў, калі тыя ў нездавальняльным стане.

Прафесійных рэстаўрацыйных рук рэгіёнам не хапае хранічна. Як распавёў "К" галоўны захавальнік фондаў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе" Аляксандр Рак, на ўсю Мінскую вобласць ёсць толькі адзін музейны мастак-рэстаўратар. Вікенцій Пузанкевіч аддана працуе ў Заслаўі ўжо не адзін год, спрыяючы захаванню і ратаванню багатых фондаў музея-запаведніка.

Ні пра якія абсталяваныя дарагой апаратурай майстэрні весці гаворку ў гэтым выпадку не даводзіцца. Пры такім фінансаванні, якое мае музей, асноўным інструментам застаецца сам чалавек, яго веды і часта кемлівасць.

— Работы для аднаго спецыяліста вельмі многа, і таму пры ўсім жаданні мы не здатныя дапамагаць нашым калегам з іншых музеяў Міншчыны, хаця такія звароты і бываюць, — тлумачыць Аляксандр Рак. — Максімум, што можам зрабіць у адказ на просьбы калег — гэта вусная кансультацыя. Тым болей, у музеяў часам няма нават грошай ці транспарту, каб даставіць свае прадметы. Ды і для камандзіровак, каб на месцы правесці ўважлівы агляд і даць больш дэталёвыя парады, мы не заўсёды маем сродкі і, галоўнае, час, бо перазагружаныя ўласнымі праектамі. Апрача правядзення рэгулярных планавых рэстаўрацыйных работ, бываюць жа і пазапланавыя — шмат якія прадметы даволі старыя, і з імі розныя непрыемнасці могуць здарыцца проста "ад узросту". Да таго ж, перад кожнай выставай мы праводзім кансервацыю ўсіх экспанатаў. Гэта — абавязковы пункт у музейнай справе. Але, на жаль, далёка не кожны музей можа сабе яго дазволіць.

Напэўна, ідэальным варыянтам было б стварэнне ўласных рэстаўрацыйных службаў пры кожным музеі, хай сабе нават раённым. Але цяжка не пагадзіцца з тым, што на практыцы гэта, бадай, немагчыма. Дзе ў маленькім гарадку знайсці сродкі на сучаснае абсталяванне? А кваліфікаваныя кадры адкуль там могуць узяцца?

Без належнай тэхнікі правесці і даследаванні твораў мастацтва, і іх рэстаўрацыю часам проста немагчыма. Напрыклад, толькі рэнтген можа паказаць, што пад жывапісным слоем ёсць яшчэ адзін — больш ранні. І такое, як сведчаць музейшчыкі, бывае даволі часта, і не толькі са старымі абразамі, дзе наяўнасць "шматслойнай выявы" — звычайная справа, але і з больш познім жывапісам.

Ці не адзіным музеем Беларусі, які мае свой рэнтген-апарат, з'яўляецца Нацыянальны мастацкі. Іншыя "выкручваюцца" як могуць. Прыкладам, захавальнікі даўніны з Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея, дзякуючы наладжанаму супрацоўніцтву з мытнымі структурамі, змаглі прыцягнуць да сваіх даследаванняў рэсурсы фірмы, якая пастаўляе ў краіну экспертна-крыміналістычнае абсталяванне. Іншым разам даводзіцца звяртацца па рэнтген і ў мясцовую паліклініку.

— Нават нягледзячы на нашу неймаверную загрузку, любы музей можа звярнуцца да нас па дапамогу ў пытаннях рэстаўрацыі, і мы нікому не адмовім, — кажа Святлана Дзікуць. — Натуральна, такая работа не можа рабіцца бясплатна, бо Нацыянальны мастацкі нясе на яе вялікія выдаткі. На жаль, далёка не ў кожнага музея ёсць патрэбныя сродкі, таму звяртаюцца да нас не так і часта.

Як тлумачыць рэстаўратарка, вынікі такой сітуацыі даволі сумныя. Адсутнасць рэгулярнага прафесійнага нагляду і, што яшчэ горш, непрафесійная псеўдарэстаўрацыя выходзіць для артэфактаў бокам:

— Часам яны трапляюць да нас ужо ледзь не ў аварыйным стане, а гэта значна павялічвае і аб'ём работы, і яе кошт, і, што яшчэ горш, паніжае шансы на поспех. Таму вырашаць пытанне тут трэба прынцыпова.

ЦЭНТР У МУЗЕЙНЫМ КВАРТАЛЕ

Сітуацыю ў маштабах краіны мог бы выправіць адзіны буйны рэстаўрацыйны цэнтр, здатны служыць патрэбам усіх беларускіх музеяў. Некалькі гадоў таму былі агучаныя планы яго стварэння пры Нацыянальным гістарычным — на плошчах будынка па вуліцы Фрунзе. Аднак жыццё ўнесла ў іх свае карэктывы. Пакуль што музею па-ранейшаму бракуе плошчаў не толькі для рэстаўрацыйнага цэнтра, але і пад фондасховішчы і новыя экспазіцыі. На шчасце, летась справа нарэшце ссунулася з мёртвай кропкі — бліжэйшым часам Нацыянальны гістарычны атрымае новы будынак. Але, як патлумачыла намеснік дырэктара музея па навуковай рабоце Ніна Калымага, стварэнне рэстаўрацыйнага цэнтра там не прадугледжанае: гэта будзе суцэльная экспазіцыйна-выставачная прастора.

У выніку эстафету перахапіў Нацыянальны мастацкі музей. Пад кіраўніцтвам яго генеральнага дырэктара Уладзіміра Пракапцова была распрацаваная канцэпцыя стварэння на базе рэстаўрацыйнага аддзела асобнага цэнтра ў адным з будынкаў музейнага квартала. Увядзенне яго ў эксплуатацыю магло б значна паспрыяць справе ратавання музейных прадметаў — гэта б дало магчымасць пашырыць не толькі плошчы, але і штат супрацоўнікаў. Тым болей, як запэўніў мяне Сяргей Вечар, музейны цэнтр будзе яшчэ больш высокатэхналагічнай устаноўкай, чым цяперашнія майстэрні. Адразу пасля прыняцця рашэння аб яго стварэнні пачалі фарміравацца заяўкі на набыццё абсталявання для даследчых і рэстаўрацыйных работ. Многія з іх раней у Беларусі правесці было альбо вельмі праблематычна, альбо наогул немагчыма.

Апрача стварэння рэспубліканскага цэнтра, вырашэнню праблемы рэстаўрацыі музейных прадметаў мае паспрыяць і паўстанне цэнтраў рэгіянальных — скажам, абласных — якія б не толькі выконвалі ўласна рэстаўрацыйныя работы, але і забяспечвалі навукова-метадычнай дапамогай рэстаўратараў з больш дробных музеяў, здзяйснялі рэгулярны агляд іх фондаў, а таксама падрыхтоўку музейных захавальнікаў да прэвентыўнай кансервацыі.

Як мы паведамлялі, стварэнне першага такога цэнтра ўжо ідзе пры Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі (гл. № 45 за 2017 год). Больш за тое, як патлумачыў яго дырэктар Юрый Кітурка, гэты цэнтр будзе мець не проста рэгіянальны, але і міжнародны характар, бо паўстане ў рамках праекта з Музеем Падляшша суседняга Беластока, з якім выйграны сумесны грант.

— Плённае супрацоўніцтва дзвюх устаноў цягнецца ўжо не першы год. Гэта і абмен выставамі, і ўзаемныя паездкі для абмену досведам і павышэння кваліфікацыі, і сумесныя акцыі. Цяпер яшчэ і такі праект, — тлумачыць дырэктар.

Абодва музеі сутыкаліся з аднолькавымі праблемамі. У Беластоку музей не так даўно страціў будынак, у якім быў размешчаны рэстаўрацыйны цэнтр, гродзенскі яго ніколі і не меў, а рэстаўратары месціліся ў памяшканнях, ніякім чынам не прыстасаваных для іх працы.

Згодна з праектам, майстэрні будуць размешчаны ў асобным будынку пачатку XX стагоддзя, не так даўно атрыманым гродзенскім музеем. Навукова-даследчы рэстаўрацыйны цэнтр будзе працаваць з усімі музеямі вобласці, многія з якіх не маюць рэстаўратараў у сваіх штатах.

У выніку, "на падыходзе" два музейныя навуковыя рэстаўрацыйныя цэнтры. Спадзяемся, што запасу трываласці, закладзенага ў музейныя прадметы іх стваральнікамі, хопіць, каб дачакацца, пакуль для кожнага з іх знойдзецца свой майстар.

■■■

— Вядома, рэстаўрацыя — гэта перадусім людзі, а не абсталяванне, — перакананая Святлана Дзікуць. — Аднак абсталяванне майстэрняў таксама вельмі важна. Бо калі няма мікраскопаў, то чалавечае вока не зможа нечага пабачыць. Вышэй за фізічныя магчымасці не скокнеш, а яны маюць межы. І таму сучасная тэхніка цудоўна дапаўняе класічныя рэстаўрацыйныя сталы, пэндзлі і скальпелі. Хаця, паўтаруся, гэта толькі дадатак да самога рэстаўратара. Якаснае абсталяванне палепшыць якасць работ толькі тады, калі будзе ў "якасных" руках. К

Навука не для невука

Валянціна ВАЛЧКОВА,
начальнік аддзела Магілёўскага абласнога цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы

Ніводная сфера дзейнасці, калі яна хоча развівацца і працаваць на вынік, не можа абысціся без навуковага суправаджэння. 2017-ы, аб'яўлены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Годам навукі, быў заклікаць актывізаваць навуковую дзейнасць у краіне. Спадзяюся, што так яно і адбылося ў шматлікіх даследчых інстытутах і лабараторыях. А як быць установам культуры, дзе навуковая дзейнасць не з'яўляецца асноўнай?

У штаце цэнтра няма ніводнага навуковага работніка ці чалавека з вучонай ступенню. Але… У адпаведнасці з Кодэксам аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь "метадычным цэнтрам народнай творчасці (культурна-асветнай работы) з'яўляецца арганізацыя культуры або падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія аказваюць метадычную дапамогу суб'ектам культурнай дзейнасці і праводзяць аналітычна-даследчую працу ў сферы культуры". Адсюль можна вылучыць два асноўныя напрамкі навуковай дзейнасці абласных метадычных цэнтраў: дыягностыка-аналітычная работа і даследаванне, вывучэнне і фіксацыя мясцовых узораў традыцыйнага мастацтва і фальклору.

Дыягностыка-аналітычная праца дазваляе аказваць адрасную і своечасовую метадычную дапамогу клубным установам вобласці, якія мы курыруем. Так вызначаецца, што каму патрэбна і якімі аптымальнымі формамі гэта зрабіць. Штогод спецыялісты нашага цэнтра праводзяць маніторынг праблемных момантаў прафесійнай дзейнасці клубных работнікаў.

Найбольш важнымі аспектамі гэтай работы ў Год навукі стала правядзенне ва ўстановах раённых цэнтралізаваных клубных сістэм дыягностыкі якасці арганізацыі працы клубных фарміраванняў. Вынікам стала карэкціроўка іх спектра, перапрафіляванне з улікам інтарэсаў жыхароў і сучасных плыняў і кірункаў. Гэткім жа чынам прааналізавалі і якасць культурна-забаўляльных мерапрыемстваў. Выбарачны маніторынг клубных устаноў усходніх рэгіёнаў Магілёўшчыны (наведалі 44,8% клубных арганізацый сямі раёнаў) абнадзейваў: кожная ў роўнай ступені імкнецца спраецыраваць культурна-забаўляльныя мерапрыемствы на ўсе катэгорыі насельніцтва.

Аднак работнікі культуры не ў поўнай меры выкарыстоўваюць разнастайнасць формаў культурна-дасугавай дзейнасці, інфармавання насельніцтва аб сваіх паслугах. Выяўлена і тое, што клубнікі не надта актыўна асвятляюць сваю дзейнасць у СМІ.

Найбольш працаёмкая і змястоўная навуковая работа праводзіцца метадычнымі цэнтрамі для вырашэння задачы даследавання, вывучэння і фіксацыі мясцовых узораў традыцыйнага мастацтва і фальклору. Летась, да прыкладу, ладзілі фестываль фальклорнага мастацтва "Скарбніца Падняпроўя". Раёны прэзентавалі святы з тэатралізаванымі паказамі абрадаў зімовага, веснавога, летняга і восеньскага цыклаў народнага календара. Пабочнаму назіральніку падаецца, што фестываль — самамэта. Не, гэта дэманстрацыя выніку даследчай работы!

У раёнах праводзілася работа па выяўленні лакальнага фальклорнага матэрыялу: песеннага, музычнага, вуснага. Гэта ў сваю чаргу дапамагло пашырыць рэпертуары аматарскіх вакальна-харавых калектываў. Адной з задач для раёнаў ставілася прыцягненне ў калектывы дзяцей, што і было прадэманстравана падчас правядзення выніковых святаў. У ходзе рэалізацыі праекта майстры дэкаратыўна-прыкладнай творчасці назапасілі шмат цікавых ідэй па вырабе дробнай сувенірнай прадукцыі.

Мы павінны актуалізаваць фальклорны матэрыял: перавесці яго ў сучасныя даступныя і зразумелыя формы да ўзроўню аднаўлення і функцыянавання. У прыватнасці, па выніках праекта выяўлены матэрыялы салдацкіх і рэкруцкіх песень. Спецыялісты цэнтра іх апрацавалі, правядуць работу па расшыфроўцы, а потым з'явіцца і метадычны дапаможнік для работы творчых калектываў.

Наш цэнтр з'яўляецца своеасаблівай лабараторыяй, дзе назапашваюцца ўласныя напрацоўкі і апрабацыі дадзеных, неабходных для працы клубных устаноў. Апошнім часам выдадзены шэраг зборнікаў практычных матэрыялаў для арганізацыі дзейнасці метадычных службаў, клубных фарміраванняў, якія папярэдне апрабавалі ў працы клубныя ўстановы.

Камп'ютар, які ведае дзеканне з аканнем

У топ-10 вынікаў дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі за 2017 год увайшоў новы слоўнік і яго метадалогія

Як пісаў Чэстэртан, сапраўднага чалавека пазнаць не цяжка: у яго боль у сэрцы і ўсмешка на твары. Сапраўднага аўтэнтычнага беларуса таксама пазнаць даволі лёгка: з яго-ным, паводле Пімена Панчанкі, звонкім "дзе" і густым "чаго", з яго "мяккім" вымаўленнем слоў тыпу "сьнех" і "сьмех", цвёрдым "р", "аканнем" ды "яканнем". А каб гэтую адметную маўленчую аўтэнтыку захаваць, варта яе кадыфікаваць — прывесці да нормы і замацаваць у слоўніку.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ



АД ЛІНГВІСТА ДА ПРАГРАМІСТА

Летась такі грунтоўны лінгвістычны даведнік, у якім замацаваныя нормы правільнага літаратурнага вымаўлення, быў падрыхтаваны і выдадзены. Маю на ўвазе "Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы", дзе прадстаўлена 117 тысяч слоў. Яго стварылі "гуманітарыі" і "тэхнары" (ці "лірыкі" і "фізікі", каму як даспадобы), спецыялісты двух інстытуцый Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры і Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі.

Важнасць такога слоўніка несумненная для работнікаў культуры, выкладчыкаў навучальных устаноў, журналістаў і ўсіх тых, хто ў сваёй прафесійнай дзейнасці штодзённа карыстаецца вуснай і пісьмовай формамі беларускай літаратурнай мовы. Каб дакладна перадаць правільнае вымаўленне, у слоўніку выкарыстаны спецыяльны спосаб запісу слоў — так званая фанетычная транскрыпцыя. Затранскрыбіраваныя словы бяруцца ў квадратныя дужкі, мяккасць літар перадаецца знакам ['], падаўжэнне фіксуецца двукроп'ем — напрыклад, [с'он':а] (сёння) — кожны гук абазначаецца асобным значком.

З дапамогай слоўніка можна даведацца, што беларусы вымаўляюць слова "снег" як [с'н'эх], а не як [сн'ек] (руская арфаэпічная норма) ці [с'н'іг] (украінская арфаэпічная норма). Што трэба казаць "ня трэба", "бяз радасці" (а не "не трэба", "без радасці"), "зьвінець", "сьвісцець", "песьня" (а не "звінець", "свісцець", "песня"), "йіх", "йіней" (а не "іх", "іней"), "фудбол", "прозьба" (а не "футбол", "просьба") і гэтак далей.

Але ў чым навізна гэтага слоўніка? Як патлумачыў "К" дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ігар Капылоў, даведнік створаны з прымяненнем інавацыйных падыходаў — камп'ютарных праграм інструментальнай апрацоўкі гукавых файлаў.

— Падчас працы над даведнікам было зроблена комплекснае даследаванне беларускага літаратурнага вымаўлення, што дазволіла выключыць фактар несістэмнасці ці, можна сказаць, фактар суб'ектыўнасці ў перадачы матэрыялаў і вырашыць шэраг спрэчных момантаў, звязаных з арфаэпічным асваеннем новай лексікі, — зазначыў суразмоўца. — Да таго ж, гэтая праца выканана з дапамогай найноўшых тэхнічных сродкаў. А гэта вельмі важна для развіцця сучаснага беларускага мовазнаўства, у прыватнасці, для такога яго кірунку, як камп'ютарная лінгвістыка.

Па словах Ігара Капылова, да мінулага года распрацоўкі Інстытута мовазнаўства ў топ-10 вынікаў дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі яшчэ не ўваходзілі. Гэта яшчэ адзін красамоўны факт, які сведчыць на карысць і перспектыўнасць сумеснай працы лінгвістаў і праграмістаў.

7 ЧАЛАВЕКА-ГАДОЎ: МНОГА ЦІ МАЛА?

Адзін з укладальнікаў "Арфаэпічнага слоўніка беларускай мовы", доктар філалагічных навук, загадчык аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства Валянціна Русак кажа, што праца над слоўнікам расцягнулася на год.

— Але яна магла доўжыцца і болей, асабліва калі б у нас не было тэхнічнай падтрымкі з боку супрацоўнікаў Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі, — заўважае візаві. — Па маіх падліках, мы такім чынам ашчадзілі пяць-сем чалавека-гадоў.

У чым жа заключалася дапамога інфарматыкаў? Як распавёў адзін з укладальнікаў "Арфаэпічнага слоўніка беларускай мовы", аспірант лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Станіслаў Лысы, усё пачалося з таго, што супрацоўнікі лабараторыі распрацавалі аўтаматычную сістэму сінтэзу маўлення і выклалі яе ў інтэрнэт для вольнага карыстання. Прынцып работы сінтэзатара маўлення выкарысталі пасля і для аўтаматычнай генерацыі транскрыпцый слоў.

Станіслаў Лысы стварыў для гэтага асобны сэрвіс — "Генератар арфаэпічнага слоўніка". Спачатку яго тэсціравалі лінгвісты, якія вышуквалі памылкі і перадавалі іх у лабараторыю на выпраўленне. У выніку сэрвіс навучыўся генераваць транскрыпцыі амаль бездакорна — з дакладнасцю ў 98 %.

— Нам удалося дамагчыся гэтага, дзякуючы правілам, якія прапісалі ў машынным алгарытме загадчык лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення Юрый Гецэвіч, я і некаторыя іншыя яе супрацоўнікі, — кажа Станіслаў Лысы. — А самая цяжкая праца была над выключэннямі з правілаў: як, напрыклад, перадаць з дапамогай машыннага алгарытму "г" выбухное ў словах "гузік", "гонты", "глузд" і падобных? Падвесці пад гэтае выключэнне нейкі алгарытм надзвычай складана, так што часам прыходзілася дзейнічаць "уручную".

У выніку праграмісты змаглі зрабіць чарнавы варыянт слоўніка і перадаць яго на вычытку экспертам з Інстытута мовазнаўства. А з такім матэрыялам лінгвісам — Валянціне Русак і навуковаму супрацоўніку аддзела сучаснай беларускай мовы Інстытута мовазнаўства Вераніцы Мандзік — было працаваць нашмат лягчэй, чым распісваць кожнае са слоў паасобку. Вось таму і атрымалася, што замест сямі гадоў праца над слоўнікам была скончана ўсяго за адзін.

З ПРЫЦЭЛАМ НА БУДУЧЫНЮ

Дарэчы, як сцвярджае Станіслаў Лысы, гэты праект дапамог не толькі мовазнаўцам, але і праграмістам.

— Дзякуючы супрацоўніцтву з Інстытутам мовазнаўства, мы змаглі ўдасканаліць сваю аўтаматычную сістэму сінтэзу маўлення, і цяпер яна перадае транскрыпцыю самых розных беларускіх слоў з дакладнасцю ў 99 %, — адзначыў суразмоўца. — Невялічкі працэнт памылак — гэта, зазвычай, словы-выключэнні, для якіх алгарытм прапісваць даволі складана і не заўсёды патрэбна.

Ужо сёння ў лабараторыі распазнавання і сінтэзу маўлення разглядаюць іншыя праекты, якія яны маглі б зрабіць разам з лінгвістамі.

— Адзін з іх — праца над агучваннем арфаэпічнага слоўніка, — кажа Станіслаў Лысы. — Думаю, кожнаму будзе цікава не толькі прачытаць у транскрыпцыі тое ці іншае беларускае слова, але і паслухаць з дапамогай сінтэзатара маўлення, як яно гучыць.

Таксама, па словах візаві, плануецца стварэнне на аснове ўжо наяўнага сэрвісу www.corpus.by цэнтральнай граматычнай электроннай базы беларускай мовы. Тут можна будзе праверыць напісанне любога беларускага слова па ўсіх наяўных слоўніках.

Ужо цяпер на названым сэрвісе можна выбраць пункт "Праверка правапісу". Праграма "прагоніць" тэкст і па беларускіх слоўніках, і па слоўніках на замежных мовах. Як кажа Станіслаў Лысы, сэрвісы Corpus.by ўвесь час паляпшаюцца, дзеля чаго ствараюцца новыя машынныя алгарытмы, а таксама наладжана зваротная сувязь з усімі зацікаўленымі асобамі, якія дасылаюць свае прапановы і заўвагі аўтарам праекта.

Так што ў хуткім часе можна будзе чакаць новых цікавых дасягненняў на памежжы інфарматыкі і лінгвістыкі. А вядомае супрацьстаянне "фізікаў" і "лірыкаў" цяпер можна лічыць завершаным — на карысць абодвух бакоў.

К

Меркаванне экспертаў

Слоўнік, які патрэбны кожнаму

Не так даўно беларуская навука, культура, ды і грамадства наогул атрымалі доўгачаканае грунтоўнае навуковае даследаванне — "Арфаэпічны слоўнік беларускай мовы", у якім упершыню даецца апісанне літаратурнага вымаўлення больш за 117 тысяч слоў, у тым ліку і новых запазычанняў.

Слова як адзінка мовы, якое прагучала, мае націск, графічнае ўвасабленне, пэўную арфаграфію, адпаведную граматычную форму, семантыку, а таксама валентнасць, дзякуючы якой будуюцца словазлучэнні і сказы. Слова як сродак зносін, якое прагучала з вуснаў чалавека, прываблівае да яго ці, наадварот, адварочвае суразмоўцу. Значыць, фанетыка і арфаэпія — гэта пачатак лінгвістыкі, пачатак жыцця слова, а таксама і стасункаў асобы. Менавіта гэтая выснова яшчэ раз пацвярджае навуковую значнасць і практычную вартасць слоўніка. Ён аўтаматычна становіцца даведнікам амаль па ўсіх раздзелах мовазнаўства: фанетыцы і арфаэпіі, словаўтварэнні і марфалогіі, лексікалогіі і акцэнталогіі.

Спадзяёмся, слоўнік стане настольнай кнігай кожнага лінгвіста сучаснай фармацыі навукоўцаў, паколькі ў ім шырока прадстаўлена даўнозапазычаная і новая запазычаная лексіка, а таксама глыбінны пласт спрадвечна беларускіх слоў, якія немагчыма вымаўляць без замілавання: вятрак, вятох, вясёлка, жытка, мацунак, мроіва, муляцца, катушок, слодыч, смага, слушны, залоўка, дзевер, шурын, шчадрэц... Слоўнік з поспехам выкарыстаюць выкладчыкі і студэнты ВНУ Беларусі (асабліва няпрофільных — тэхнічных, эканамічных, тэхналагічных і гэтак далей) для выпрацоўкі ўменняў і навыкаў беларускага літаратурнага прафесійнага маўлення.

Такія лінгвістычныя даведнікі заўсёды запатрабаваныя настаўнікамі і выкладчыкамі, пісьменнікамі і журналістамі, дыктарамі радыё і тэлебачання, акцёрамі і рэжысёрамі вядучых драматычных тэатраў Рэспублікі Беларусь, эстраднымі выканаўцамі, супрацоўнікамі сферы рэкламы.

...Карацей, такі слоўнік патрэбны ўсім!

Ніна ГАЎРОШ,
Алена БАГАМОЛАВА

У дзясятку найлепшых леташніх дасягненняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ўвайшлі даследаванні навукоўцаў Інстытута гісторыі. Яны былі адзначаны за адкрыццё ў Палессі унікальных для сусветнай гістарычнай навукі славянскіх паселішчаў, а таксама раскрыццё працэсу фарміравання і развіцця раннеславянскай супольнасці на тэрыторыі Беларусі.

Алег КЛІМАЎ / Фота аўтара

Хітрыкі нашых продкаў

На Прыпяцкім Палессі ліквідуюць лакуны гісторыі славян

АДСЕДЗЕЛІСЯ Ў БАЛОЦЕ

— Прыемна, вядома, чуць у дачыненні да той працы, якой мы з калегамі займаліся летась, такое вызначэнне, як "унікальныя", але я б замяніла яго іншым словам — можа, "сенсацыйныя"? — усміхаецца навуковы супрацоўнік аддзела захавання і выкарыстання археалагічнай спадчыны Ганна Бяліцкая.

Даследуе Палессе яна ўжо амаль тры дзясяткі гадоў. Летась Ганна Мікалаеўна кіравала экспедыцыямі, якія вялі раскопкі каля вёсак Бярэжцы і Малы Малешаў Жыткавіцкага раёна і Ясковічы Салігорскага раёна. У прафесіі археолага яе цікавіць усё тое, што звязана з зарубінецкай культурай, якая лічыцца прыналежнай да ранняга жалезнага веку. Вывучаючы месцы старажытных паселішчаў Прыпяцкага Палесся, Ганна Мікалаеўна прыйшла да высновы, што часавыя рамкі распаўсюджвання гэтай культуры шырэй.

У класічнай тэорыі яе заканчэнне датуецца II-м стагоддзем — пра гэта сведчыць спыненне "дзейнасці" могільнікаў. Аднак знойдзеныя беларускімі навукоўцамі артэфакты, на думку спадарыні Бяліцкай, кажуць пра тое, што познезарубінецкі перыяд трываў яшчэ доўга, што жыццё ў паселішчах працягвалася, а з нібыта "памерлымі" магільнікамі не ўсё так пэўна. А гэта азначае і тое, што працэс фарміравання раннеславянскай супольнасці не быў перарывістым.

Адны апаненты Ганны Мікалаеўны мяркуюць, што ў нейкі далёка не цудоўны дзень здарылася якаясьці глабальная катастрофа, і адмераны для зарубінцаў тэрмін на гэтай планеце скончыўся. Іншыя перакананыя: у іх паступовым знікненні вінаваты прыход на тыя землі готаў. Бяліцкая ж лічыць, што карэннае насельніцтва нікуды не падзелася, проста адна археалагічная культура плаўна трансфармавалася ў наступную.

— Пакуль готы хадзілі туды-сюды са сваімі захопніцкімі паходамі ў Чарнамор'е, пакуль дзесьці скакалі гуны на сваіх конях, славяне на Палессі адседзеліся і захаваліся. А потым разам з суродзічамі з іншых рэгіёнаў сталі распаўсюджвацца па ўсёй Еўропе — у ціхім балоце чэрці водзяцца! — смяецца вучоная. — Прырода ў Прыпяцкім Палессі была вельмі багатая, жывёл у лясах і рыб у рэках — процьма. Земляробства, жывёлагадоўля, промыслы, рамёствы — усё там было на высокім узроўні. Мяркуючы па знаходках, якія мы зрабілі, нашы продкі мелі вельмі развітую цывілізацыю!

Сярод знаходак Ганна Бяліцкая вылучае гліняныя хлябцы, кудмень з кіпцюром мядзведзя, косці жывёл, аскепкі керамікі і асабліва бронзавую фібулу з падвязной ножкай, знойдзеную ў Бярэжцах, і абярэг "лунніца", выяўлены ў Ясковічах. Вынікі разведвальных раскопак у гэтай вёсцы — адкрыццё жытловага комплексу — археолаг як раз і называе сенсацыйнымі, новымі старонкамі ў вывучэнні гісторыі развіцця да- і раннеславянскай супольнасці на беларускіх землях. Адкапаныя там рэчы — у прыватнасці, фрагменты посуду — яна датуе другой паловай II-га стагоддзя і першай — III-га. Сёлета работы ў гэтым месцы ахопяць вялікую плошчу, і храналагічныя лакуны працягнуць запаўняцца. Чакаюць экспедыцыі ў 2018-м і тыя ж Бярэжцы ды Малы Малешаў.

РЫДЛЁЎКІ НЕЗАМЯНЯЛЬНЫЯ

На маё пытанне пра тое, як наогул фінансуюцца археалагічныя раскопкі, спадарыня Бяліцкая недвухсэнсоўна ўздыхнула. Няма ахвотных паспрыяць грашыма і сярод прыватнікаў. Нехта, магчыма, і дапамог бы (вунь як многія з іх клянуцца ў любові да мінулага уласнай краіны!), ды ўсё яшчэ, напэўна, чакаюць закон, які ўрэгулюе такі спонсарскі ўдзел. Нядзіўна, што пакуль у сваёй працы вучоная абыходзіцца без найноўшага абсталявання. Зрэшты, нават пры яго наяўнасці рыдлёўкі і шуфлі нішто замяніць не зможа.

— Хачу шчыра падзякаваць за дапамогу ўсім валанцёрам — гэтым закаханым у свой край і яго гісторыю людзям, — кажа Ганна Мікалаеўна. — Каб не яны, ужо і не ведаю, ці змаглі б мы здзейсніць столькі адкрыццяў. Назаву я хаця б траіх: гэта Міхаіл Шруб, які ўзначальвае адну з сялянскіх гаспадарак, ветэрынарны ўрач па адукацыі Вольга Харытановіч і масавік-забаўнік Алена Байкоўская.

Апошнюю спадарыня Бяліцкая ўпарта "сватае" Тураўскаму краязнаўчаму музею: маўляў, яна б сфармавала — у выпадку неабходнасці — экспазіцыю, звязаную з археалогіяй так, як гэта і належыць зрабіць. Ды падкрэслівае, што без такіх энтузіястаў археалагічныя экспедыцыі маглі б апынуцца пад пагрозай правалу.

Ганна Бяліцкая.

На раскопках у Бярэжцах.

— Наогул, Беларусі, вядома, патрэбны асобны інстытут археалогіі, — перакананая Ганна Мікалаеўна. — Сорамна, што краіна з вялікай гісторыяй і самабытнай культурай да гэтага часу не мае такой установы.

КАПАЧЫ ПАКУЛЬ НЕ СУЦІШЫЛІСЯ

Задаў я і іншае праблемнае пытанне: пра "чорных капальнікаў". Ці паменела іх пасля адпаведных зменаў у заканадаўстве?

— Так, — і Ганна Мікалаеўна зноў уздыхае. — Тым не менш, гэта з'ява ўсё яшчэ звычайная. І, калі археолагі з'язджаюць, на раскопкі тут жа накіроўваюцца тыя, хто хоча чымсьці на іх пажывіцца. Не навялі яшчэ на ўсіх такіх людзей страху.

Узаемадзеяннем з уладамі на месцах вучоная ў цэлым задаволеная: чым могуць, яны дапамагаюць — людзьмі, часам тэхнікай, транспартам. Але ўсё-такі ёй хочацца большай аператыўнасці ў рэагаванні на пэўныя сітуацыі. Каб не здаралася так, як з накапанай ў Бярэжцах печчу, калі чыноўнікі нейкі час "чухалі рэпу" — а навошта ім гэты шматвяковы экспанат, куды яго падзець? Усё ж, артэфакт уладкавалі у той жа Тураўскі музей.

— Я па сваёй натуры, хутчэй, аптымістка — можа, нават залішне безжурботны чалавек, — сустрэчу з карэспандэнтам "К" спадарыня Бяліцкая заканчвае на пазітыўнай ноце. — Так, ёсць цяжкасці, будуць яны і надалей, але іх пераважвае тая праца, якой я прысвяціла сваё жыццё, якой аддаюць свае сілы мае калегі, якой наогул займаецца наш інстытут. Мы вяртаем роднай Беларусі яе мінулае, а той, хто яго не ведае, як цяпер часта кажуць, пазбаўлены будучыні. Цалкам і поўнасцю падпісваюся пад гэтымі словамі. Так што чакайце ад нас новых адкрыццяў, знаходак — не менш сенсацыйных!

К

Марфалогія горада — ад сярэднявечча да класіцызму

Не так даўно ў выдавецтве "Беларуская навука" выйшла ў свет манаграфія доктара архітэктуры, прафесара БНТУ Юрыя Чантурыі "Беларускае горадабудаўнічае мастацтва: сярэднявечная спадчына, рэнесанс, барока, класіцызм у сістэме еўрапейскага дойлідства". Паўтысячы старонак і амаль тысяча выяваў — гэта толькі колькасныя паказчыкі, якія сведчаць пра важкасць фаліянта ў нашай гістарычнай навуцы.

Аўтар упершыню выканаў дасканалы аналіз і тэарэтычна абагульніў нацыянальнае горадабудаўнічае мастацтва эпох Сярэднявечча і Рэнесансу, а таксама барока і класіцызму ў яго пастаянным узаемадзеянні з дойлідствам Расіі і Заходняй Еўропы. Шырока і падрабязна паказана культура горадабудаўніцтва, разгледжаны прасторавая арганізацыя паселішчаў, іх грамадскіх цэнтраў і асобных комплексаў забудовы.

Даследаваны 115 гарадоў Беларусі, вывучаны каля 650 архіўных гісторыка-картаграфічных і іншых выяўленчых дакументаў, распрацаваны больш за 200 графічных рэканструкцый. У выніку, выяўленыя гістарычныя заканамернасці арганізацыі паселішчаў: функцыянальныя, марфалагічныя, стылявыя, кампазіцыйныя, метралагічныя.

Аўтар упершыню дае цэласнае навуковае ўяўленне аб эвалюцыі горадабудаўніцтва ў другой палове XVI — першай палове XVIII стагоддзя. Паводле Чантурыі, яно ўключала тры напрамкі развіцця — на аснове нерэгулярных планіровачных структур старажытнарускага генезісу, сярэднявечных па характары гатычных рэгулярных структур, а таксама структур рэнесансных. Адзін з новых аспектаў працы — выяўленне асаблівасцяў гарадоў, збудаваных паводле ўзораў раннехрысціянскіх сталіц і біблейскіх правобразаў.

У даследаванні даказана, што класіцыстычнае горадабудаўніцтва другой паловы XVIII — першай паловы XIX стагоддзя — частка вялікай культуры еўрапейскага класіцызму — было тыпалагічным, структурна-планіровачным і эстэтычным феноменам, які грунтуецца на засваенні гістарычнага досведу. Распрацавана разгорнутая тыпалогія і прасочана сістэма прынцыпаў кампазіцыі архітэктурных ансамбляў плошчаў, а таксама іншых комплексаў — вуліц, кварталаў, манастыроў.

Фундаментальную працу, якая ўключае болей за 900 малюнкаў, можна лічыць важным этапам у развіцці нацыянальнай гісторыка-горадабудаўнічай навукі. Не выклікае сумневу, што манаграфія, якая, па сутнасці, стала вынікам амаль 50-гадовай навуковай дзейнасці аўтара, будзе карыснай не толькі для навукоўцаў, студэнтаў і аматараў мінуўшчыны, але і для "практыкуючых" архітэктараў-праекціроўшчыкаў, а асабліва — для тых прадстаўнікоў уладных структур, ад якіх залежыць сённяшняе аблічча гарадоў. Як пераканаўча даводзіць спадар Чантурыя, у нашых продкаў ёсць чаму павучыцца.

Ала ШАМРУК,
доктар мастацтвазнаўства

КУЛЬТУРА WWW.KIMPRESS.BY № 4 / 27 СТУДЗЕНЯ 2018 г.
Art-блог 9

Беларускія п’есы forever

Надзея БУНЦЭВІЧ

На мінулым тыдні Цэнтр беларускай драматургіі пачаў прыём п’ес на конкурс-фестываль WriteBox-2018. Здавалася б, зусім нядаўна там скончыўся Тыдзень сучаснай беларускай драматургіі “Канцэнтрацыя”, што літаральна “ўсутыч” працягваў Рэспубліканскі фэст у Бабруйску, прысвечаны ідэнтычнай праблематыцы. Але гэта менавіта той выпадак, калі замнога не бывае. Бо размова ідзе пра нацыянальную драматургію, а тая не павінна развівацца лакальна, штуршкамі, ад адной падзеі да другой, з вялікімі перапынкамі — не, толькі forever. Без аглядкі, але з рэгулярным аглядам таго, что напісана і пастаўлена.

“Без Ягора будзе гора”.

“Камедыя Юдзіфі”.

Кульмінацыяй згаданага тыдня “Канцэнтрацыя”, які сабраў суцэльнае суквецце найлепшых сцэнічных увасабленняў у РТБД беларускіх п’ес, лекцыі і творчыя сустрэчы, стала не зусім звычайная прэм’ера — **“Калгаснікі”**, пастаўленыя 27-гадовым Цімафеем Ткачовым паводле “Трох дзён у пекле” Паўла Пражко. Творчасць гэтага беларускага драматурга часцей увасабляюць у Расіі, чым у нас. Рэжысёр цяперашняга спектакля таксама прыехаў адтуль, бо заканчвае вучобу ў Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай акадэміі тэатральнага мастацтва. Але дагэтуль, нагадаем, ён скончыў нашу Акадэмію мастацтваў — як акцёр працаваў у Тэатры беларускай драматургіі,


“Калгаснікі”.

паралельна здымаючыся ў шматлікіх расійскіх кінастужках (дарэчы, упершыню ён зняўся яшчэ 10-гадовым хлопчыкам на “Беларусьфільме” ў “Зорцы Венеры”). “Калгаснікі” — яго рэжысёрская дыпломная праца.

Пасля прагляда думкі падзяліліся. П’еса “Тры дні ў пекле” цалкам адпавядае сваёй назве: яна пякучая з-за ўзнятых праблем і чорная з-за адсутнасці “святла ў канцы тунэля”. Рэжысёр тое святло знайшоў. А разам з ім — і ўласны погляд на падобную драматургію, “не падобную” да драматургіі нават паводле формы: замест звыклых дзеючых асоб — празаічны тэкст, прычым непаслядоўны, фрагментарны, бы асобныя “лісткі з альбома” змрочных успамінаў. Пачытаеш — не па сабе становіцца, настолькі жорстка, без аніякіх падхарошванняў зроблены злепак з непрыхаванай праўды жыцця. Вось ён, рэалізм! Ужо не проста той, што з’явіўся калісьці ў “крытычны” момант развіцця грамадства, а папраўдзе крызісны. Што называецца, з якерай у руках: толькі яна можна разабрацца з усім набалелым — адсекчы яго.

У тым жа кірунку “крызіснай тэрапіі” робяцца звычайна і спектаклі паводле Пражко: праўдзівыя, але безапеляцыйныя, з панаваннем змрочных тонаў. Зусім іншыя, найперш іранічныя асацыяцыі выклікае ўжо сама назва спектакля — “Калгаснікі”. Асабіста ў мяне адразу гучыць у вушах частка араторыі “Пазт” Дзмітрыя Смольскага на вершы Янкі Купалы: “Я — калгасніца маладая, жыву весела, ані дбаю”, дзе музыка ўшчэнт разбівае быццам бы “правільна камуністычны” пасыл словаў, ускрываючы іх сапраўдны сэнс і горка саркастычную ўсмешку. Рэжысёр любіць сваіх персанажаў — як могуць бацькі любіць дзяцей, нават калі тыя вырастаюць далёкімі ад ідэалу. Бо яны ж “не чужыя — нашыя”.

Спектакль становіцца выкшталцоным творам мастацтва, які спалучае элементы самых розных тэатральных і паратэатральных з’яў: тэатра масак, тэатра абсурда, стылёвых алюзій на дакументальны тэатр (вербацім), абрадавых дзеянняў, клаўнады, інструментальнага тэатра, site-specific, праменад-тэатра — ды ўвогуле ледзь не ўсяго спектра тэатра

Цяперашнія пастаноўшчыкі, асабліва пачаткоўцы, далёка не заўсёды звяртаюцца да прафесійных кампазітараў: навошта, калі можна і так падкласці які-небудзь “фонавых” ці ўплесці “песеньку”. А вось Ткачоў разумее, наколькі важным у спектаклі з’яўляецца не толькі тое, што мы бачым, але і што чуем. І запрашае да супрацоўніцтва маладога кампазітара Алену Гуціну — нядаўнюю выпускніцу, а цяпер выкладчыка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Тая, будучы адной з удзельніц праекта “Кінемо”, дзе маладыя кампазітары стваралі музыку да нямых стужак стогадовай даўніны, робіць штосьці падобнае і тут, іграючы на фартэпіяна. Віяланчэлістка Алена Князева і кларнетыст Антон Леўчанка займаюць месцы ў супрацьлеглых кутках пакоя, таксама становячыся ўдзельнікамі незвычайнай дзеі і рэагуючы на яе сваімі музычнымі рэплікамі. Мінімалізм спалучаецца з алеаторыкай, бо кожны з інструменталістаў мае свае імправізацыйныя фрагменты. Сістэма лейтматываў, паўтораў, вар’іравання, карэлюючыся з дзеяннем, стварае папраўдзе “поліфанічную” сцэнічную драматургію.

Сярод найбольш удалых увасабленняў новых беларускіх п’ес немагчыма не згадаць **“Камедыю Юдзіфі”**, пастаўленую ў Гродзенскім абласным тэатры лялек і паказаную на бабруйскім фестывалі нацыянальнай драматургіі. Сяргей Кавалёў зрабіў рэдакцыю сваёй п’есы менавіта ў разліку на згаданы тэатр. Спалучыў у ёй біблейскую гісторыю з постмадэрнісцкім поглядам на яе, асветніцтва — з дыскусійнасцю, якой так не хапае нашым адукацыйным праграмам. Паставіў суцэльны шэраг вострых пытанняў: ад сямейных стасункаў да палітычных, сплятаючы адносіны мужчын і жанчын з клубком міждзяржаўных праблем і ваенных кафліктаў. Адзін з плюсаў і п’есы, і спектакля, пастаўленага Алегам Жугждам, — адсутнасць безапеляцыйных адказаў і ўвогуле чорна-белага падзелу на “добрых і благіх”. За гадзіну з нечым на гледача абрынаецца такая колькасць пытанняў-разважанняў, што раздумваць над імі трэба не адзін вечар, а ўсё далейшае жыццё. Пры ўсім гэтым спектакль застаецца неверагодна мастацкім, прыгожым, у ім спалучаюцца розныя мадэлі лялек — ад пальчаткавых да батлеечных і раставых, згадваецца ледзь не ўвесь шматвекавы вопыт па ўвасабленні гісторыі Юдзіфі ў еўрапейскім мастацтве. Запрашэнне ў якасці харэографа надзвычай крэатыўнага гродзенскага майстра Дзмітрыя Куракулава прывяло да з’яўлення ў спектаклі двух пранікнёна сучасных Adagia, якімі магла б ганарыцца сусветная балетная сцэна.

Яшчэ адну п’есу Сяргея Кавалёва — “Тарас на Парнасе” — паставіў летась Слонімскі драматычны тэатр, што дало калектыву магчымасць удзелу ў бабруйскім фестывалі. Хочацца адзначыць каларытны вобраз Тараса (Уладзімір Навумік), некаторыя ўласна тэатральныя “прыколы”, адпаведныя постмадэрнісцкаму пераасэнсаванню драматургам хрэстаматыйна вядомай паэмы (да прыкладу, Геркулес паўстае хударлявым “здохлікам” з вялікім пачакам “Геркулеса” ў руках). Каб такіх дэталяў было больш, спектакль зайграў бы пырскамі маленькіх адкрыццяў, “схаваўшы” недахоп грошай на пампезна касцюміраваную даўніну.

Сярод іншых “пазасталічных” увасабленняў найноўшай беларускай драматургіі ўзгадаем **“Кроўкі на часавай восі”** ў Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя Віншэнта Дуніна-Марцінкевіча, што знаходзіцца ў Бабруйску. Спектакль Таццяны Траяновіч паводле п’есы Дзмітрыя Багаслаўскага стаў адкрыццём бабруйскага фэсту (гл. “К” № 48 за 2017 г.). Але сярод васьмі навэл (у п’есе іх дзесяць) найбольш удалай аказалася першая. Тут разам сабраліся і талент Аляксандра Парфяновіча, які ўмее трымаць залу адно сваёй постаццю, позіркам, словам, дыханнем, і відовішчнае запаўненне сцэнічнай прасторы, дзе кожная дэталь стварае шматслойны вобраз. Шэрыя будні, вакзал, чамаданы — і раптам кітайскія вееры з дзівоснымі кветкамі. Рэальнасць і мара, жыццё і смерць, статыка і рух — усё разам, у кантрасце і непарушным адзінстве. Астатнім навэлам часам бракавала такой жа сцэнічнай мастацкасці, дасканаласці ўвасаблення, бо артысты раз-пораз збіваліся на “тэатр патэтычна гаваркіх галоў”. Не заўсёды “трапляла ў яблычак” сцэнаграфія Валянціны Праўдзінай, вырашаная як набор вялізных мішэняў. Дзякуючы светлавым эфектам, яны змяняюцца, малюючы то набліжэнне цягніка, то крыж, але такіх пераўтварэнняў магло б быць больш.

Акурат пазаўчора ў драмтэатры Магілёва прэм’ерай святкавалі 70-годдзе знакамітага драматурга Васіля Ткачова, які жыве ў Гомелі. Спектакль **“Без Ягора будзе гора”** паставіў Аляксандр Дольнікаў. П’есы Ткачова даўно і трывала ставяцца ў розных краінах, карыстаючыся нязменным поспехам у публікі. І Цэнтр беларускай драматургіі, які летась адзначыў 10-годдзе, тут абсалютна ні пры чым: не трэба думаць, што ён, мауляў, “кантралюе” ўвасабленні айчынных п’ес — садзейнічае з’яўленню новых, каб у тэатраў і ў гледача было як мага больш выбару: традыцыйныя і наватарскія п’есы, розныя пастаноўкі, сцэнічныя пляцоўкі, сама эстэтыка... Беларускі тэатр і нацыянальная драматургія павінны быць і разнастайнымі. Але нязменна высокага ўзроўню. К

Разабрацца ў асаблівасцях

Выстава “Асаблівая фатаграфія” ладзілася вельмі хутка, і толькі зараз пачынаеш разумець, што ўсё ж такі часу на падрыхтоўку не хапіла. 18 студзеня пайшоў з жыцця найвыдатнейшы беларускі фатограф Юрый Васільеў. Яго знакаміты здымак з серыі “Кіжы” невыпадкова яшчэ да трагічнай падзеі быў абраны “тварам” выставы, што адкрылася днямі ў Музеі гісторыі беларускага кіно.

Ганна ШАРКО / Фота аўтара

Выстава "Асаблівая фатаграфія" ў Музеі кіно працуе да 18 лютага.



Юрый Сяргеевіч рыхтаваўся да выставы, у свае апошнія часы пісаў суправаджальны тэкст да фатаграфій, які так і не скончыў. “Гэта мая памяць...” — такі радок паўтараецца ў яго чарнавых запісах. “Гэта мая памяць” — і асноўны матыў усёй выставы Секцыі аналагавай фатаграфіі Беларускага аб’яднання фатографаў, дзе экспануюцца здымкі дваццаці выбітных аўтараў, сярод якіх Ігар Саўчанка, Віктар Бутра, Сяргей Кажамякін, Марына Бацюкова, Вадзім Качан, Уладзімір Суцягін, Валерый Вядрэнка і шмат іншых. Кожны фатограф падрыхтаваў для экспазіцыі запісаныя ад рукі мастацкія нарысы, тлумачэнні ці гісторыі да здымкаў.

— У бясконцай плыні лічбавых файлаў, якія прэзэнтуюць на тое, каб звацца фатаграфіямі, губляецца галоўная якасць здымка — тактыльнасць, дачыненне да працэсу атрымання малюнка і ўвасабленне творчай задумкі ў канчатковым выніку. Менавіта таму мы хацелі зрабіць выставу, дзе кожная фатаграфія асаблівая, унікальная. У першую чаргу — дзякуючы сваёй рукатворнасці, — адзначаюць арганізатары.

Камернае памяшканне Музея кіно таксама спрацавала на гэту ідэю. Там хочацца спыніцца хаця б на некалькі хвілін і доўга ўглядацца ў здымкі, адчуваць пах новых пашпарту і не думаць пра тое, што на свеце існуюць іншыя колеры, акрамя чорнага і белага, учытвацца ў гісторыі пад фатаграфіямі.

“Асаблівая фатаграфія” — не падвядзенне нейкіх вынікаў мінулага, якія прэзэнтуюцца сучаснаму гледачу, бо наведвальнік убачыць і здымкі, зробленыя ў савецкі час, і сучасныя работы. Выстава сведчыць аб тым, што фотамастацтва ў нашай краіне сапраўды існуе, і што незалежна ад развіцця тэхналогій яно працягвае рухацца ўсё больш імкліва. К

Чакаем на вернісаж

Не бывае мастацтва без глядацкай аўдыторыі. Нездарма плённасць дзейнасці творчых саюзаў у вачах грамады вымяраецца ступенню паспяховасці канцэртаў, спектакляў, выстаў. Вось і Беларускі саюз мастакоў, падводзячы вынікі года, звычайна акцэнтуе ўвагу на выставачнай дзейнасці.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Мінулы год прайшоў для мастакоў пад знакам 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і 950-годдзя заснавання нашай сталіцы. І найбольш амбіцыйныя і паспяховыя выставачныя праекты наўпрост ці ўскосна былі звязаныя менавіта з гэтымі датамі. У Беларускім саюзе мастакоў ужо звярстаны план выставачнай дзейнасці на гэты год. Ён зрыкла ахоплівае экспазіцыі, якія будуць разгорнутыя ў галоўнай выставачнай зале краіны — Палацы мастацтваў.

У прыватнасці, леташні “Восеньскі салон з “Белгазпрамбанкам”, які ўяўляе сабой шырокі агляд маладога мастацтва Беларусі, меў добры розгалас у калямастакоўкай грамадзе, выклікаў сапраўдную цікавасць у публікі. Доўжыць справу падтрымкі таленавітай моладзі згаданы банк будзе і сёлета. “Восеньскі салон-2018” адбудзецца ў кастрычніку-лістападзе.

А ў красавіку-маі той жа банк правядзе ў Палацы не менш маштабную “дарослую выставу” — мастацкі фэст “Арт-Мінск”. Мяркуецца, што яна прадэманструе гледачам і самім творцам ступень адаптацыі найноўшага беларускага мастацтва да рэалій глабальнага свету, адпаведнасць нашай выяўленчай мовы і ладу мыслення сучаснаму камунікацыйнаму фармату.

У сваёй выставачнай палітыцы Саюз мастакоў зыходзіць з таго, што ў Беларусі няма і не можа быць культурнай правінцыі, што ў нашай культурнай прасторы Мінск хоць і з’яўляецца месцам прыцягнення амбіцыйных асоб і рэалізацыі самых важкіх праектаў, але сутнасна — ён толькі першы сярод роўных. Пацвярджэннем гэтай тэзы з’яўляюцца рэгулярныя выставы абласных арганізацый саюза ў сталіцы. Сёлета ў пачатку чэрвеня ў Палацы будуць гасцяваць мастакі Віцебскай вобласці. Можна спадзявацца, што гледачы пабачаць, як праз творчасць сённяшніх віцебчукоў гістарычныя традыцыі трансфармуюцца ў рэчаіснасць.

У другой палове чэрвеня — пачатку ліпеня плануе зладзіць выставу ў Палацы мастацтваў хросны бацька і нязменны кіраўнік пленэру па кераміцы “Арт-Жыжаль” Валерый Каттыгін. Яна будзе зборам найбольш значных твораў за пятнаццацігадовую гісторыю пленэра. Сам спадар Валерый у рамках гэтай імпрэзы правядзе і сваю персанальную выставу.

У той жа час Палац прыме выставу “Шлях Альгерда”. Ужо з назвы відаць, што яна прысвечана памяці вялікага князя Альгерда. Ёсць спадзяванні, што мастакі, маючы пэўны досвед асэнсавання гісторыі нашай дзяржавы, здолеюць выйсці за межы просталінейнай візуалізацыі ўжо звыклых грамадзе з’яў і падзей. Што гледачы ўбачаць не проста шэраг выяваў, але канцэпцыю, актуальную для сённяшніх рэалій.

Палац мастацтваў падчас "Восеньскага салона-2017". Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

Адным з чыннікаў існавання Саюза мастакоў з’яўляюцца вытворчыя структуры, якія ператвараюць творчыя задумы ў матэрыяльныя аб’екты — манументальную і дэкаратыўную скульптуру, аздобу фасадаў і інтэр’ераў і гэтак далей. Выстава пад назвай “Арт-камбінаты” плануецца на пачатак красавіка.

У ліпені гледачоў чакае арт-праект “Семкі”. У ім будуць прадстаўленыя розныя віды мастацтва. Верагодна, што ў творах экспазіцыі будзе дамінаваць не надта сур’ёзны, іранічны погляд на шмат якія праявы жыцця. Зрэшты, праблемы лягчэй вырашаюцца, калі глядзець на іх з гумарам.

Будуць у Палацы і выставы-персаналіі. Гэта экспазіцыі твораў Уладзіміра Церашчука, Алеся Цыркунова, Пятра Прохарава, Юрыя Багушэвіча. Будзе і групавая выстава — творчай супольці “Традыцыя”, члены якой з’яўляюцца прыхільнікамі рэалістычнай вобразнасці, але сам рэалізм трактуюць вельмі шырока.

Падсумаваннем года стане Біенале жывапісу, графікі і скульптуры ў лістападзе-снежні. Як і ў мінулыя гады, у дадатак да згаданых адбудзецца і шэраг камерцыйных выстаў. К

“Лялечкі”, грыбны квас ды экалогія

У культуры нельга похапкам, адно толькі — грунтоўна і засяроджана. Так хлебароб у чаканні сяўбы сартуе насенне, рыхтуе сеялкі, ужо сёння працуе на будучы важкі ўраджай. Нацыянальная культура ўвогуле паяднаная з сельскагаспадарчым цыклам, бо абслугоўвае яго, надае духоўнасці, дадае да працы песню. Так, зіма для работніка культуры — час асэнсавання. Аглядваемся, аналізуем, робім высновы, вучымся, хто на чужых памылках, хто — на сваіх. Хтосьці спявае песню, хтосьці складае яе.

Яўген РАГІН

На здымках:
1 "Калядкі" ў Касцюковічах.
2 "Лялечкам" — 40 гадоў!
3 Падчас рэчыцкай каляднай вандроўкі.

Прыклад грунтоўнасці ды засяроджанасці — абрадавая дзейнасць мастацкага кіраўніка **Рэчыцкага** гарадскога палаца культуры (**Гомельскі** раён) Людмілы Грызуновай, яе памочніка, удзельніка мастацкай самадзейнасці клуба аматараў народнай і эстраднай песні “Зараніца” Дзяніса Сцепаненкі і іх паплечнікаў-калег. Гэта яны распавялі рэдакцыі, што амаль 25 гадоў на рэчыцкай зямлі існуе калядна-тэатральная традыцыя. Адраджэннем фальклорна-этнаграфічнай спадчыны мясцовага Палесся займаюцца сябры клуба “Жывіца”. Галоўнае, што да звычаяў продкаў далучаецца моладзь, аб'яднаная клубам “Сям'я”. “Калядныя сустрэчы” сталі для іх традыцыйнымі. Сёлета мерапрыемствы адбыліся ў бібліятэцы імя Надзеі Крупскай горада Рэчыца. А ёсць яшчэ суполка фальклорна-этнаграфічнага дзеяння і калядавання па падворках “Добры вечар, шчодры вечар!” Рэканструяваць абрад дапамагалі носьбіты традыцыі Надзея Шынгірэй і Вера Мельнік з вёскі **Коззе**. А песенны складнік абраду забяспечыла “Жывіца”. Гэтыя песні запісаны ад носьбітаў яшчэ ў 1960 — 1970-я гады мінулага стагоддзя. А найлепшай пявунняй ды прыпевачніцай лічыцца ў раёне Ніна Скараход — старэйшая ўдзельніца “Жывіцы”. Стары ж новы год усе сустрэлі ў аматараў беларускіх традыцый Алены і Алега Цэйкаў.

Намеснік дырэктара цэнтралізаванай клубнай сістэмы **Касцюковіцкага** раёна Наталля Дробышава паведамляе: *“Супрацоўнікі нашых клубных устаноў цягам двух тыдняў, у адпаведнасці з мясцовай традыцыяй, ладзілі калядныя вячоркі. У апошні дзень Калядак, 18 студзеня, каманда калядоўшчыкаў РЦК наведала ўдзельнікаў клуба ветэранаў “Полымя” і работнікаў суседняга швейнага цэха”.*

У **Дзятлаўскім** раёне, піша Настасся Голуб, распачалі этнаграфічны праект “Народнаму скарбу — век векаваць”. Ён скіраваны на адраджэнне і захаванне народных абрадава-святочных традыцый. 21 студзеня ў вёсцы **Ахонава** правялі абрад “Пасадзіць Каляду на дуб”. Рэй тут вёў, натуральна, мясцовы фальклорны гурт. Абрад адносіцца да сямейна-бытавых: у апошні дзень Калядаў збіраліся за сталом усёй сям'ёй, выстаўлялі на стол кісель, грыбны квас, студзянец, клёцкі, квашаную капусту, селядзец, сала, сыр...

Калядную варажбу ладзілі ў аграгарадку **Бялкоўшчына**, што ў **Смаргонскім** раёне. Супрацоўнікі РЦК распавядаюць, што ўдзельнікі аматарскага тэатра мініяцюр “Весялухі” падрыхтавалі святочныя віншаванні, а вакальны гурт “Чараўніцы” выканалі задзірыстыя прыпеўкі.

І яшчэ адна навіна са **Смаргоншчыны**. Раённы агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці “Расчынім акенца творчасці” адкрылі тут канцэртнай праграмай **Вішнеўскага** дома культуры, якім кіруе Ала Дыро. Пачаўся агляд з тэатралізацыі, потым прагучала песня “Віфлеемская зорачка”. Вішнеўская зямля мае вялікі творчы патэнцыял. Пра гэта сведчылі выступленні інструментальнага ансамбля “Вясёлка” пад кіраўніцтвам Святланы Манчак, салістаў Карыны Міхалькевіч, Насці і Дзяніса Дыро, Лідзіі Дубавіцкай і Вікторыі Неўскай, вакальна-інструментальнага гурта “Настальгія”, артыстаў тэатра мініяцюр.

Бібліятэчны нюанс святочнай панарамы — ад Тамары Круталевіч, загадчыка аддзела маркетынгу **Бярэзінскай** цэнтральнай райбібліятэкі. *“У новы год — з новай кнігай” — так называецца наша чарговая акцыя,* — піша аўтар. — *Звернута яна да навучэнцаў мясцовай гімназіі. Гаворка — пра каляднае апавяданне. Бібліятэчны мінітэатр “Калядныя ліхтарыкі” паспрабаваў адлюстраваць асаблівасці гэтага літаратурнага жанру... А было яшчэ ў нас літаратурнае калядаванне. Сабраліся на яго жанчыны пенсійнага ўзросту, але маладога светаўспрымання. Калядоўшчык-бібліятэкар прапанаваў ім плойму сюжэтаў калядных апавяданняў, кожнае з якіх заканчвалася маленькім цудам”.*

Зімовыя святы прайшлі, і ўжо хочацца вясну гукаць, Але ўсяму — свой час, тым больш, што бяжыць ён — не дагоніш. Здавалася, зусім нядаўна ў **Абухаве** (**Гродзенскі** раён) быў створаны ансамбль танца “Лялечкі”, а вось ужо гэты Заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь адзначае саракагоддзе. Намеснік дырэктара Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Ганна Сіманенка піша, што кіруе ансамблем Надзея Урукіна. За гэты час вырасла не адно пакаленне “лялечак” — каля 300 юнакоў і дзяўчат. 25 выхаванцаў скончылі Гродзенскі каледж мастацтваў і Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Сёння ў ансамбле — больш за 60 удзельнікаў узростам ад 5 да 17 гадоў не толькі з Абухава, але і з іншых вёсак раёна. Нават з Гродна ўдзельнікі прыязджаюць. А гэта пра многае кажа. “Пра “Лялечак” памятаюць у Турцыі, Германіі, Сербіі, Чэхіі, Балгарыі, Польшчы, Катары, Літве, Латвіі, Расіі, ва Украіне. Калектыў — двойчы ўладальнік гранта спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

Андрэй Струнчанка паведамляе, што ў **Мазалаўскім** сельскім доме культуры (**Віцебскі раён**) пачалася арт-акцыя з нагоды 80-годдзя з дня ўтварэння Віцебскай вобласці. Працуе выстава работ выкладчыка індустрыяльна-педагагічнага каледжа і кіраўніка гуртка дэкаратыўна-прыкладной творчасці Мазалаўскага СДК Вольгі Ганчаровай. Там экспануецца больш за 20 работ, выкананых у розных тэхніках выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Акцыя скончыцца ў лютым вялікім канцэртам мастацкай самадзейнасці.

А вось бібліятэка аграгарадка **Каменны Лог**, што на **Ашмяншчыне**, прапануе падарожжы па запаведных мясцінах Беларусі. Натуральна, вандроўкі завочныя, віртуальныя. Бібліятэкар установы Алена Таўкінь піша, што мерапрыемства — частка раённай праграмы “Экалогія. Кніга. Грамадства”. Чытачы паспелі “пабываць” у Белавежы, Налібоцкай пушчы, у Нацыянальных парках “Прыпяцкі”, “Нарачанскі”.

К

Тэрпсіхора з шармам

Узорная студыя сучаснага бальнага танца “Шарм” прадстаўляла Смалявічы ў канцэртнай праграме “Міншчына — ты сэрца Беларусі”. Вечар, прысвечаны 80-годдзю Мінскай вобласці, адбыўся ў сярэдзіне студзеня ў Палацы Рэспублікі.

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота з архіва студыі

Пра “Шарм” у вобласці распавядаць не трэба: узорны калектыў — неад'емны ўдзельнік шматлікіх мерапрыемстваў самага высокага ўзроўню. У студыю прымаюць дзяцей з чатырох гадоў і вядуць на працягу дзесяцігоддзяў. Многія выхаванцы сталі амаль што часткай сям'і заснавальніцы студыі Алены Мыцько. Тут няма ўзроставай “столі”: кожны танцуе столькі, на колькі хапае азарту і любові да танца. Ды і выбар у прыхільнікаў Тэрпсіхоры велізарны: у студыі можна навучыцца бальным, усходнім, сучасным танцам. Для адточвання майстэрства — частыя выступленні, прычым не толькі ў Смалявічах, але і ў канцэртных залах краіны і нават за межамі Сінявокай. Як прызнаецца Алена, сцэны мясцовага ДК падчас не хапае для маштабных нумароў, а зала не ўмяшчае ўсіх ахвотных падтрымаць выступоўцаў.

— Мы з 2002 года сябруем з французамі. На працягу шаснаццаці гадоў ладзім канцэртныя праграмы для мэрыі гарадоў Кулонь і Бюлі-ле-Мін. Летась тры дні запар выступалі з двухгадзінным сольнікам “Віват, “Шарм”. Нашым выхаванцам (гэтым разам выязджаў асноўны састаў ва ўзросце ад 18 да 24 гадоў) апладзіравалі 600 чалавек! — распавяла дырэктар смалявіцкай студыі Алена Мыцько.

Беларусы імкнуцца не паўтарацца, у кожны свой прыезд дэманструюць новыя нумары. Толькі адно застаецца нязменным: блок беларускіх танцаў, з якімі спадарыня Алена лічыць сваім абавязкам пазнаёміць замежных сяброў — “Лявоніха”, “Купалінка”, “Беларуская полька”.

Выступае "Шарм".

Жыццё студыі настолькі пераплялося з Францыяй, што адна з яе удзельніц пачала працаваць на дзве краіны: Караліна Мыцько з'яўляецца педагогам “Шарма” і адначасова вядзе харэаграфію ў Францыі. Французы высока ацанілі беларускі прафесіяналізм: у 2017-м Караліна атрымала ўзнагароду ад мэра горада ў намінацыі “Найлепшы педагог сярод выкладчыкаў-жанчын па танцах у Бюлі-ле-Мін”.

К

Напэўна, назваць гэты аграгарадок сталіцай беларускага народнага ткацтва было б, усё ж, занадта гучна. Але тое, што такі мастацкі промысел сярод іншых займае ў Мастоўскім раёне асаблівае месца — факт бясспрэчны. Таму і выбар майго праваднікa па "культурных" Гудзевічах быў наканаваны — чалавекам гэтым павінен быў стаць той, хто і адраджаў там гэта рамяство. Пагатоў, знакамітая ткачыха Вера Ігнатаўна БЕЛАКОЗ, як мне па сакрэце паведамілі мясцовыя добразычліўцы, заўсёды "сячэ" тое, што думае. А для "К" гэта і трэба!

Алег КЛІМАЎ, Мінск — аграгарадок Гудзевічы Гродзенскай вобласці — Мінск / Фота аўтара

Кацярына Басінская.

Гудзевічы: фальклорная місія выканальная

Як зрабіць, каб моладзь не шлындала

Антаніна Чэрнік.

Вера Белакоз.

Дзед Бялун.

Падвойныя дываны.

У хаце "XIX стагоддзя".

КАРАТКЕВІЧ І ДЗЕД БЯЛУН

Знакаміты Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей справіць сёлета сваё 50-годдзе. А пачынаўся ён у мясцовай школе стараннямі краязнаўцы Алеся Белакоза. Заслужанага настаўніка і заслужанага дзеяча культуры Беларусі, на жаль, не стала ў 2016 годзе, але справа яго жыве. Алесю Мікалаевічу прысвечаны і асобны стэнд у музеі. Матэрыялы для яго спярша падбіраліся зыходзячы са школьнай праграмы, а ў далейшым тэматыка пашыралася, як і задачы ўстановы ў цэлым. У 1981-м школа з будынка з'ехала, і ён быў цалкам аддадзены пад экспанаты.

Экспазіцыя сапраўды ўражвае: у яго залах знаходзяцца і вырабы рамеснікаў, і карціны прафесійных ды самадзейных мастакоў, і многія ўнікальныя артэфакты, звязаныя з гісторыяй нашай літаратуры. Як для вясковага музея, колькасць рарытэтаў тут проста зашкальвае. Напрыклад, сярод прадстаўленых кніг ёсць эпахальная для нашай нацыі "Дудка беларуская" Францішка Багушэвіча 1896 года выдання — а іх ва ўсім свеце мо толькі пару асобнікаў і засталося. Ёсць асадка, якой Уладзімір Караткевіч пісаў раман "Каласы пад сярпом тваім". Усяго ў асноўным фондзе каля 17 тысяч прадметаў. Нават гэта яшчэ не ўсё!

У 1981 годзе на тэрыторыі, якая належыць музею, з'явіўся яго этнаграфічны аддзел — хата, стылізаваная пад сярэдзіну XIX стагоддзя. А побач з ёю цяпер стаіць драўляная статуя Дзеда Бялуна — апекуна падарожнікаў і тых, хто заблукаў у лесе. Наведвальнікам гэтай часткі ўжо па-сапраўднаму музейнага комплексу прапануюцца разнастайныя тэматычныя праграмы з народнымі песнямі, танцамі і гульнямі.

У 2012 годзе музей стаў адным з партнёраў праекта транспамежнага супрацоўніцтва Польшча-Беларусь-Украіна па ўключэнні этнакультурных рэсурсаў у турыстычную дзейнасць. Дзякуючы немалому гранту ў музеі былі праведзеныя рамонтныя работы, палепшылася яго інфраструктура. Нарэшце з'явіліся сапраўдны гардэроб і санвузел, не забыліся і на шапік з сувенірамі. Праўда, рээкспазіцыя закранула пакуль толькі чатыры выставачныя залы, прысвечаныя акурат літаратуры і ткацтву, а яшчэ тры чакаюць сваёй чаргі. Як толькі крыніцы фінансавання для гэтага знойдуцца, установа і запрацуе на ўсю сваю літаратурна-краязнаўчую моц.

— У нашай музейнай дзейнасці ёсць рэчы, якія мы робім, каб выканаць пастаўленыя перад намі фінансавыя абавязкі, і ёсць тое, што робім для душы, — сказала мне дырэктар музея Кацярына Басінская. — Пры выкананні плана платных паслуг, а менавіта наведвальнасці, арыентуемся, перш за ўсё, на навучэнцаў — мясцовых і тых, якія прыязджаюць на экскурсіі. А для душы ў нас — залы, прысвечаныя ткацтву — народнаму рамяству, якім Гудзевічы і славяцца.

Ля вытокаў адраджэння "фірмовага" ткацтва стаяла настаўніца пачатковых класаў Вера Белакоз, жонка Алеся Мікалаевіча, якая ўсё ў той жа школе ў 1970 годзе стварыла адпаведны гурток. А ў 1990-х ужо ў музеі працавала некалькі гадоў зала практычнага ткацтва (цяпер установа праводзіць майстар-класы), тады ж і пачалася збірацца калекцыя падвойных дываноў, самы стары з якіх — 1898-га года. Тэхналогія іх вытворчасці занесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. У планах музея — стварэнне майстэрні па вырабе такіх дываноў. І — душа душой, але... у будучыні адна з "ткацкіх" залаў павінна дапоўніцца матэрыяламі, звязанымі з кавальствам, салома- і лозапляценнем, вырабамі з дрэва. Балазе, у гэтым краі спакон веку квітнелі самыя розныя ўмельствы.

Карацей кажучы, развіццё ўнікальнага музея не спыняецца і сёння, ужо пасля сыходу з жыцця яго заснавальніка. І таму ўзнікае натуральнае пытанне: чаму ў такі ўнікальны музей не валяць валам турысты? Кацярына Вітальеўна прызналася, што пакуль не ўдалося ўстанавіць больш цесныя кантакты з турагенцтвамі, якія маглі б са свайго боку забяспечваць рэгулярны прыток экскурсантаў.

Каментарый Веры БЕЛАКОЗ:

— Мне цікава ўсё, што адбываецца ў музеі. Радая той асаблівай увазе, якая нададзеная ў ім ткацтву. Шкада толькі, знікла зала народнай медыцыны — цяпер ад яе застаўся адзін стэнд. Ды і многія іншыя старадаўнія прадметы пахавалі ў сховішча. Кажуць, калі адчыняць астатнія залы, усё вернецца на свае месцы. Паглядзім. І, напэўна, было б правільным надаць музею імя Алеся Мікалаевіча — усё ж ён стаяў ля вытокаў гэтай установы. Але пасля смерці майго мужа раптам пайшлі размовы, што ў стварэнні музея — не толькі яго заслуга, што нехта яму яшчэ дапамагаў. "Хто?" — пытаюся я. У адказ — маўчанне. Дзіўна для мяне гэта ўсё і крыўдна!

ПАРАСТКІ ЦЯГІ ДА РОДНАГА

У загадчыцы Гудзевіцкага цэнтра вольнага часу і культуры Антаніны Чэрнік свая крыўда таксама ёсць.

— Увесь час мы сутыкаемся з тым, што дзеці, якія прыязджаюць на нашы мерапрыемствы з Гродна і іншых гарадоў вобласці, аказваецца, нічога не ведаюць пра беларускі вясковы побыт, — панаракала яна. — Нават песень народных не ведаюць. Больш за тое — ім гэта нецікава. Хто вінаваты? Вядома, і школа ў тым ліку. Мабыць, ёсць у нас настаўнікі, якія так "прышчапляюць" любоў да гісторыі краіны, да яе культуры, што навучэнцам усё гэта ў выніку абыякава. І я, быць можа, рэзка скажу, але мне вельмі хацелася б паглядзець у вочы таму чалавеку, які такі прадмет, як спевы, пакінуў толькі для пачатковых класаў. Што хлапчукі і дзяўчынкі, нават чацвёртакласнікі, за гэты час зразумеюць пра беларускую музыку, што запомняць з яе? Натуральна, амаль нічога. Адкуль тады любові да яе ўзяцца?

Установа імкнецца ліквідаваць прабелы ў адукацыі, абуджаючы ў падлетках патрыятычныя парывы — напрыклад, серыяй вясновалетне-восеньскіх імпрэзаў пад агульнай назвай "Гудзевіцкі фэст", які арганізуецца ў садружнасці з музеем. У яго рамках сваё мастацтва дэманструюць ткачыхі, танцоры, музыканты. Цэнтрам распрацаваны шэраг анімацыйных праграм, якія не проста забаўляюць, а ўводзяць у свет беларускіх традыцый. У аграгарадку першымі ў Мастоўскім раёне сталі шырока адзначаць і Купалле.

— І місія наша вынікі дае, — пасвятлела тварам Антаніна Мікалаеўна. — Падлеткі, якія прыязджаюць у Гудзевічы, мне неаднаразова казалі, што мы, работнікі Цэнтра, сваімі мерапрыемствамі на іх паўплывалі. Некалі ў зусім яшчэ маленькіх дзетках, якія ўпершыню пабывалі ў аграгарадку, спачатку прабіліся першыя парасткі цягі да нацыянальнай культуры, а па меры сталення нарадзілася і сапраўдная цікавасць да яе.

Фінансава ўстанова адчувае сябе нармальна, на правядзенне буйных святаў дадатковыя сродкі ёй вылучаюцца, яе апаратура і абсталяванне не так даўно былі абноўленыя, у пазамінулым годзе зроблены рамонт фасада, летась — пастаўленыя тры шклопакеты. "Можа, хацелася б і папаўнення сцэнічных народных касцюмаў, — задумаўшыся, вымавіла загадчыца. — Але ўпэўненая, што гэтая праблема хутка вырашыцца".

Каментарый Веры БЕЛАКОЗ:

— Я яшчэ, быццам бы, нядаўна з сяброўкамі хадзіла ў Цэнтр — у клуб "Гарачыя сэрцы". Казалі пра тое-сёе, песні спявалі, гарбату пілі. Але цяпер ужо перасталі туды хадзіць, старэнькія мы — мне вунь 84 гады. А мясцовай моладзі, мне здаецца, Цэнтр не надта патрэбны. Раней хоць дыскатэкі ў ім былі, цяпер — ужо не. Моладзь або ў горад паступова з'язджае, або шлындае па Гудзевічах без толку, нават бацькам па гаспадарцы не дапамагае.

І ўсё гэта сведчыць, што, нягледзячы на тыя відавочныя поспехі, якіх дасягнулі работнікі культуры ў Гудзевічах, працы ў іх яшчэ вельмі і вельмі багата. Ды, зрэшты, а дзе яе сёння бракуе?

К

“Я адкалоўся ад свайго пакалення”

З'ехаўшы, куды прыйшоў Уладзімір Казлоў

Добра, што ён жыве ад мяне далёка. Калі б ён быў маім суседам, верагодна, прымяніў бы да мяне метады фізічнага ўздзеяння за тое, што напішу ніжэй. Я і дагэтуль лічу яго самым модным сучасным рускамоўным пісьменнікам на прасторах былога Саюза, народжаным на беларускай зямлі. І слова “модным” у дадзеным выпадку для мяне з’яўляецца сінонімам прыметнікаў “цікавы” і “неардынарны”. Да іх яшчэ просіцца вызначэнне “андэрграўндны” — ва ўсякім разе, да кінематографа Уладзіміра КАЗЛОВА яно таксама дакладна адносіцца.

Алег КЛІМАЎ / Фота Аляксандра ПРАЛЕТАРСКАГА

НЕ ДА СЛЁЗ, АЛЕ... ЛЮБІМЫ?

— Гледзячы з вышынь 2018 года, ад чаго быў уцёкамі пераезд у Маскву? І ці задаволены вы сёння расійскай сталіцай?

— З’язджаў хутчэй не ад чагосьці, а ў надзеі на нешта новае. Кажучы трошкі шаблонна, тыя магчымасці, што былі ў мяне ў Мінску, я ўжо вычарпаў, далей рухацца не было куды. Я разумеў, што хачу займацца літаратурай, а ніякага асаблівага літаратурнага асяроддзя, як і кнігавыдавецкай індустрыі, у Беларусі, на мой погляд, тады не было. А ў Расіі пачынаўся бум сучаснай рускамоўнай прозы, з’яўляліся выдавецтвы, выходзілі кнігі, было цікава. І калі паступіла прапанова аб працы ў Маскве, без асаблівых разважанняў яе прыняў.

Цяжка сказаць — задаволены або незадаволены я расійскай сталіцай. Яна таксама змянілася за гэтыя гады вельмі моцна. У сярэдзіне 2000-х я заспеў у ёй адгалоскі вар’яцкага, яркага, хаатычнага часу 1990-х, той свабоды на мяжы анархіі. Потым усё змянілася. Масква — горад занадта камерцыялізаваны, кансумерысцкі, што мне не надта блізка. Але я прывык да ўсяго гэтага, горад ужо не выклікае нейкіх асаблівых эмоцый, у мяне ў ім ёсць любімыя месцы, склаліся з ім нейкія ўзаемаадносіны.

— А якім вам бачыцца Магілёў, калі ў яго вяртаецеся?

— З ім у мяне адносіны не самыя простыя. Так, я ў ім нарадзіўся, пражыў свае першыя 20 гадоў. Бачыў яго розным. Але тое, што я з яго ўцёк — было непазбежным. На той момант гэта быў тыповы постсавецкі — ці “савецкі” — горад сярэдняга памеру, што не развіваўся так, як гэтага хацелася асабіста мне. З тых часоў ён вельмі моцна змяніўся, як, напэўна, і іншыя беларускія гарады. Калі б мне цяпер давялося экранізаваць які-небудзь з маіх тэкстаў, у якім дзеянне адбываецца ў 1980-я гады, было б складана знайсці ў Магілёве адпаведную натуру. Многае перабудавана да непазнавальнасці ды акультурана — хаця культурнага жыцця, калі прыязджаў туды, мне ў горадзе не хапала. Узровень яго ўсё ж падаваўся мне трохі правінцыйным. Калісьці, дзякуючы мясцоваму музычнаму дзеячу Віталю “Шуму” Дарашэнку, Магілёў ператвараўся ў андэрграўндную музычную сталіцу Беларусі, а цяпер нічога падобнага я не адчуваю.

Даведка

Уладзімір КАЗЛОЎ, 45 гадоў. Нарадзіўся ў Магілёве. Скончыў Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт па спецыяльнасці “Англійская мова”. З 2000 года жыве ў Маскве. Пісьменнік, кінарэжысёр. Вялікая частка яго работ прысвечана моладзі перыяду перабудовы і постперабудовы — так званаму “страчанаму пакаленню”.

УСЕ МЫ ДЗЕЦІ ПРАХАДНЫХ ДВАРОЎ

— Часам вас называюць “спеваком андэрграўнднага жыцця”, некаторыя проста так і кажуць аб адмысловым, “чарнушным” поглядзе на рэчаіснасць. Што светлага знаходзіце і ў ёй наогул, і, у прыватнасці, у цяперашняй культуры?

— На маю думку, творчая задача любога аўтара заключаецца ў тым, каб не перабольшваць, не лакіраваць рэчаіснасць. Наадварот: да яе варта падыходзіць крытычна, паказваць такія яе бакі, якія людзі лічаць за лепшае не заўважаць. Я і гляджу на рэальнасць дастаткова жорстка. А слова “чарнуха” не люблю, яно мне здаецца пагардлівым. Ды і родам, мабыць, з часоў савецкай прапаганды: “ачарненне сацыялістычнага ладу” і ўсё такое. Але акрамя дрэннага, у жыцці шмат і светлага, нейкая гармонія ў ім усё-такі існуе (нават у сённяшнім вар’яцкім свеце). Не толькі ў культуры ды мастацтве. Вось — добрая раніца, і тое адчуванне, якое яна дае, можа быць нашмат каштоўнейшым за пачутую музыку або прачытаную кнігу.

— Ці цікава вам, чым ды як жывуць учарашнія падлеткі, пацаны, што спавядалі законы гопніцтва, контркультуры ў шырокім сэнсе, дзеці прахадных двароў?

— Я не ставіў бы знак роўнасці паміж імі. Апошнія, як мне здаецца, з таго пакалення, якое ўвайшло ў свядомае жыццё пры познім “саўку”, калі сістэма загнівала, станавілася ўжо зусім бачная яе фальш, агіднасць. І ў гэтым сэнсе простае, нават у чымсьці прымітыўнае азначэнне — “дзеці прахадных двароў”, аўтарам якога з’яўляецца Віктар Цой, аказалася вельмі дакладным. Але тое, як жыве маё пакаленне сёння, мне не вельмі цікава, я ў нейкі момант адкалоўся ад яго, ператварацца ў нейкага сарака з лішнім гадоў абывацеля. Падзяляць спадзяванні, трывогі, думкі з такімі людзьмі мне не хочацца.

А да пацаноў-гопнікаў цяпер, праз многія гады, стаўлюся з вялікім разуменнем і спагадай. Адна справа — знаходзіцца побач з імі ў двары, у школе, іншая — глядзець на іх з пэўнай часавай, а таксама і прасторавай дыстанцыі.

— Самыя мае любімыя вашы літаратурныя творы — гэта “Попс” і... “Гопнікі”. Перачытваючы іх, думаю, што дарэчнымі былі б іх рымейкі ці што. Наогул, не хацелася б вам напісаць штосьці накшталт сагі?

— У мяне ёсць умоўная трылогія, у якую ўваходзяць “Гопнікі”, “Школа” і “СССР: дзённік пацана з ускраіны”. Яе і можна ўспрымаць як нейкую сагу, што ахоплівае перыяд з 1984-га па 1989-ы гады. Так, галоўныя героі, якія з’яўляюцца маімі альтэр эга, там трошкі адрозніваюцца адзін ад аднаго, але ўсё роўна гэта адзін і той жа чалавек. Пра яго ўжо досыць шмат сказана, і рухацца з ім далей у нейкі новы час, у новыя ўзросты і рэальнасці мне не вельмі цікава. Хаця героі з “Гопнікаў” праз шмат гадоў раптам уваскрэслі ў кароткай і не вельмі вядомай аповесці “Нашы”.

“ТЭЛЕМУВІКІ” НЕ ПРАПАНОЎВАЦЬ!

— Вы былі адным з аўтараў сцэнарыя даволі рэзананснай карціны Андрэя Прошкіна “Гульні матылькоў” 2004 года. Пасля працы над ёй вырашылі абраць шлях менавіта незалежнага кінематаграфіста?

— Сапраўды, цікавасць да кіно з’явілася пасля працы над гэтым фільмам. Раней я быў ад гэтага віду мастацтва вельмі далёкі. Любіў яго на ўзроўні гледача, але пра тое, каб самому што-небудзь у ім рабіць, нават і не думаў. А калі ўпершыню сутыкнуўся з кінавытворчасцю, дзякуючы таму, што быў адным са сцэнарыстаў “Гульняў...”, з’ездзіў на Berlinale Talent Campus — міжнародную маладзёжную платформу для кінематаграфістаў-пачаткоўцаў. Паслухаў там нейкія лекцыі, паўдзельнічаў у семінарах, звязаных з кіно, і зразумеў, што мне хочацца паспрабаваць нешта ў ім зрабіць. Але кіно як індустрыя мяне не надта прыцягвала. Карціна Андрэя была як раз такім абсалютна мэйнстрымавым праектам, а асяроддзя незалежнага кіно ў Расіі тады яшчэ не было, як і тэхнічных магчымасцяў для гэтага. Калі яны з’явіліся, я і паспрабаваў за іх учапіцца, не працуючы ў рамках індустрыі, без яе бюджэтаў.

— Як аўтару выдатнага дакументальнага фільма пра сібірскую панк-культуру 1980-х гадоў “Сляды на снезе” ці не шкада вам яе герояў, якія біліся з сістэмай, а... вось як яно ўсё абярнулася? “Пластмасавы свет перамог”, — праспяваў Ягор Летаў.

— Гэта вельмі складаная з’ява, якая выходзіць далёка за межы музыкі і культуры ў цэлым. Сібірскі панк быў па сутнасці антысавецкім і, вядома, зрабіў нейкі ўнёсак у развал сістэмы. Ну а тое, куды ўсё далей рушыла і да чаго прыйшло — музыка ў тым ліку — прадбачыць было немагчыма. Тым болей, неяк перашкодзіць працэсу. Я на некалькі гадоў за іх маладзейшы і таму ва ўсім гэтым ніяк не ўдзельнічаў. Хай і з пэўным перабольшаннем, але гэты рух можна было б параўнаць — з тым, што адбывалася ў клубе CBGB у Нью-Ёрку 1970-х, з Лонданам крыху больш позніх гадоў, дзе гралі Sex Pistols і Clash.

— Наколькі вы знаёмыя з цяперашнім беларускім кіно?

— Да сваёй радасці, я бачу, што там сёе-тое адбываецца. Больш на ўзроўні незалежнага кіно — дакументальнага, кароткаметражнага: сённяшнія тэхналогіі дазваляюць здымаць фільмы, не маючы вялікага бюджэту і доступу да абсталявання кінастудый. Поўны метр, натуральна, без адпаведных грашовых уліванняў зняць даволі складана.

— Не хацелася б прапанаваць свой творчы праект “Беларусьфільму”?

— Перасячэнне з індустрыяй кіно ў той жа Расіі ў мяне былі нязначныя, і ісці ў індустрыю беларускую ды несці туды які-небудзь уласны праект не вельмі хочацца. Мне цяжка сабе ўявіць, што я пайду на “Беларусьфільм” і стану нешта прапаноўваць. Ідэя зняць фільм у Беларусі ёсць, мне гэта цікава, і калі нешта атрымаецца, то, хутчэй, як незалежнае кіно. Але тэарэтычна я не выключаю нічога: калі будуць магчымасці для працы, то, натуральна, пры сур’ёзнай вытворчасці з сур’ёзнымі грашыма я гатовы ісці і на кампраміс. Але, напрыклад, “тэлемувікамі” я б не стаў займацца ніколі.

К

Імпэт і магія “справы моцных”

Ілья СВІРЫН

Паверыць у тое, што рэжысёр Уладзімір АРЛОЎ ужо адсвяткаваў 20-годдзе з таго дня, калі ён стаў атрымліваць пенсію (гэта яго ўласная фармулёўка), асабіста мне было вельмі складана. Як і выказаць юбіляру звыклы набор зычэнняў. Назіраючы за яго ўпэўненымі рухамі — як у кіно, гэтак і па жыцці, — бачачы ў вачах папраўдзе маладзецкі запал, ты можаш хіба пажадаць хаця б толіку такога імпэту самому сабе, які пенсію яшчэ далёка не заслужыў.
Таму і нядзіўна, што гаварылі мы не столькі пра справы мінулых дзён (хаця зважаючы на “паслужны спіс” візаві, маглі б гаварыць пра іх суткамі), колькі пра новыя праекты. Балазе, рэжысёр насамрэч ні на якую пенсію не выходзіў. Сведчаннем таму — нядаўняя прэм’ера яго фільма “Пясняр. Сэрцам і думамі”. Увогуле, постаць Мулявіна пастаянна ўсплывала падчас нашай гутаркі. Гэта сімптаматычна, калі ўлічыць, што адбылася яна акурат напярэдадні сумных угодкаў смерці Песняра.

Фота Юрыя ІВАНОВА

— Яшчэ ў 1971 годзе вы знялі легендарную цяпер гэтак званую “Батлейку” — першы і, пэўна, лепшы пункт у “песняроўскай” фільмаграфіі. З таго часу, здавалася б, пра Мулявіна сказана ўжо не раўнуючы ўсё. Ці не боязна было вам зноў брацца за гэтую тэму?

— Не думаю, што яна вычарпаная. Калі гадоў дзевяць таму я задумаў зняць трылогію пра “Песняроў”, было назапашана процьма матэрыялу, які ў тыя серыі (а іх атрымалася толькі дзве) так і не ўвайшоў. Тады перад маёй камерай апынуліся як самыя блізкія Мулявіну людзі, гэтак і, напрыклад, супрацоўнікі ДАІ, якія першымі прыбылі на месца той аўтакатастрофы. Агулам — 29 чалавек! І кожны быў вольны казаць тое, што лічыць патрэбным. У сваёй кнізе я потым апублікаваў гэтыя інтэрв’ю без купюр.

Але нават валодаючы такім вялікім архівам, я ўсвядоміў: пра Песняра ўсё яшчэ можна распавесці нешта новае, паказаўшы тыя грані яго асобы, якія і дасюль мала каму вядомыя. І менавіта на іх я рабіў акцэнт у фільме. Першая — Мулявін і кіно. Ансамбль браў удзел і ў маіх фільмах, і ў многіх іншых праектах. Другая тэма — гумар Мулявіна. Прычым ён выяўляўся не ў анекдотах або “хатніх нарыхтоўках”, а выключна ў імправізацыях, у гэткім слоўным фехтаванні. Ты яму нешта скажаш — а ў адказ ён як выдасць! У фільм уключаныя кадры сямейнай хронікі, дзе ёсць акурат такія эпізоды.

— Але скразная яго лінія, усё ж, іншая — і таксама нечаканая. Чаму вы так шмат здымалі ў Жыровіцкай семінарыі?

— Я ўзняў вельмі важную і пакуль не раскрытую да канца тэму — набыццё Мулявіным веры. У Гродна ў яго быў духоўнік айцец Анатоль, але я абраў для фільма іншую асобу — рэгента хора Жыровіцкай семінарыі айца Андрэя Скробата. Бо, як апавядае ён у фільме, шлях Мулявіна да царквы ішоў праз музыку — і менавіта яна спрычынілася да іх знаёмства. Дарэчы, фінал стужкі, калі Пётр Ялфімаў і айцец Андрэй пачынаюць на два галасы спяваць “Мой родны кут” — гэта ўвогуле імправізацыя! Добра, што мы тады не выключылі камеру.

— Адпаведна, без неспадзяванак не абышлося?

— На жаль, не толькі прыемных. Вось вы кажаце, што пра Мулявіна і “Песняроў” усім усё вядома. Добра, каб яно было так! Для фільма мы замовілі ў Маскве матэрыял з фільматэкі цэнтральнага тэлебачання — і даведаліся з яго вопісу, што песня “Ручнікі” — народная, а не Мікалая Пятрэнкі на верш Веры Вярбы. Болей за тое — аказваецца, вершы “Вераніка” і “Ад родных ніў” належаць журналісту ЦТ СССР Гімерверту Анісіму Абрамавічу! Шчыра кажучы, нават не ведаю, хто ён такі. І добра, каб гэта быў выпадковы ляп, але тое імя згадваецца шматразова ў дакументах фільматэкі. Адпаведна, можа і на экран дзесьці выплысці. Чаму так здарылася? Думаю, прычына толькі адна — абыякавасць. Маўляў, якая тут розніца: Багдановіч або Гімерверт?

— У фільме вы ставіце пытанне: у чым сакрэт усенароднай любові? А вось адказ на яго не фармулюеце.

— А яго і немагчыма сфармуляваць, у тым і справа! Неяк я пытаўся ў Ігара Лучанка, як з’явіліся тыя яго песні, што сталі папраўдзе народнымі? Той адказаў: ды вельмі проста! Сеў за фано, узяў нотныя аркушы — і напісаў. Мой сябра, кампазітар Яўген Глебаў заўсёды дзівіўся, калі яго калега казаў фразу “Я працую над песняй”. Маўляў, як гэта можна над ёй працаваць? Калі яна не нарадзілася сама сабою, значыць... мо ўжо і не трэба? Возьмем тых жа “Песняроў”. “Волагда” ў іх выкананні стала суперхітом неспадзявана для ўсіх. А вось “Слухай, цешча”, якая была наўмысна замоўленая ў самой Пахмутавай, у народ чамусьці не пайшла — хаця, здаецца, і тэма ж актуальная. Чаму — ніхто не ведае.

Сакрэт — ён на тое і сакрэт, што ніхто не разумее яго механіку. Іначай — ужо не сакрэт, а інфармацыя. Цягам васьмі гадоў мне давялося пабыць галоўным рэжысёрам мінскага цырка. І калі я намаўляў старэйшага Кіа падзяліцца сакрэтам таго ці іншага фокуса, той яго так раскрываў, што за падвойным дном апыналася яшчэ адно.

— Аднак многія імкнуцца тыя сакрэты разгадаць. Нават цэлыя тэорыі выдумляюць...

Кадр з фільма “Пясняр. Сэрцам і думамі”.

> *“Рэжысура — гэта справа моцных. Калі ўпершыню закрылі мой фільм, я з месяц ляжаў на канапе ўтыркнуўшыся носам у сцяну. Калі ў другі раз — усяго тыдзень. А калі ў трэці, дык наогул успрыняў гэта даволі спакойна.*

— У творчасці павінна заставацца нейкая таямніца, нейкая свайго кшталту магія — іначай будзе проста нецікава. І сакрэты павінны заставацца таксама. Калі актрыса пачынае распавядаць падрабязнасці здымак нейкай складанай сцэны, тлумачачы, што падчас кахання ў ледзяной вадзе яна пад сукенку апранула гідракасцюм, карціць схапіць яе за руку: “Дурніца, нашто ты ўсё гэта кажаш?”

Зрэшты, у выпадку з “Песнярамі” пэўныя прычыны поспеху мы акрэсліць можам. Найперш гэта, вядома, талент, інтуіцыя. Як добра сказаў слынны музыка Уладзімір Ткачэнка, у Мулявіна было пачуццё цэлага. Вось тут трэба ўступ, тут пройгрыш, тут лепей за ўсё зрабіць акапэльна. Астатнія ўдзельнікі ансамбля літаральна пераймалі яго дыханне.

Аднак апрача таленту, павінна быць яшчэ і рамяство. Я не лічу гэтае слова лаянкавым — наадварот, вельмі яго паважаю. Касманаўт Уладзімір Кавалёнак неяк распавядаў мне, што на канцэрце “Песняроў” у Зорным гарадку раптам вырубілся электрычнасць — нават дзіва, што такое там магло здарыцца. І хлопцы злолелі ладны час утрымліваць залу толькі з дапамогай сваіх галасоў, спяваючы “Кожны чацвёрты” ў поўнай цемры.

— У фільме згадваецца невядомы для многіх факт: аказваецца, вы планавалі зрабіць экранізацыю песняроўскай рок-оперы “Гусляр”.

— У маёй кватэры вісяць тры эскізы, выкананыя мастфільмаўскім мастаком Паўлам Ілышавым. Вось, па сутнасці, і ўсё, што засталося ад той задумы. Хаця яна была больш чым сур’ёзнай. Разам з балетмайстрам фільма Валянцінам Елізар’евым ды іншымі членамі пастановачнай групы мы выправіліся ў Навагрудак. Пастаялі на Замкавай гары, якая мелася стаць здымачнай пляцоўкай — тым самым Курганам. Размеркавалі, дзе што будзе...


Фота Юрыя ІВАНОВА

“Пладзіце зайздроснікаў! Яны не дадуць вам спачываць на лаўрах”

Але як толькі запусціліся — адразу вокрык з Масквы: вы што, Арлоў жа ўжо зняў гістарычны фільм “Камедыянт”, колькі можна? Ды і ўвогуле, на дварэ — 1987 год, 70-я ўгодкі рэвалюцыі! Прэтэнзіі былі для нас незразумелымі — пагатоў, Купалаў гусляр у кожным разе супрацьстаяў класава чужароднаму князю. “Але гэта ўсё адно супрацьстаянне ўладзе!” — патлумачылі нам. Дасюль шкадую, што не знайшоў выйсця з той “сітуёвіны” (хаця быў шанц перавесці фільм на “мясцовы экран” ды пазбыцца тым самым апекі “цэнтра”) ды ўсё ж не запусціўся. А праз нейкі час і “Песняры”, і Елізар’еў, і я да той задумы астылі.

Быў, дарэчы, і яшчэ адзін прыкры выпадак такога кшталту. З фільма “А таксама цырк” катэгарычна загадалі выразаць шыкоўны ролік на песню “Як тут не смяяцца”, напісаную Мулявіным на словы Купалы. Прычына адна — гэтыя словы аказаліся папраўдзе неўміручымі, і ў сатырычных персанажах, якія з’яўляліся на экране пад гукі песні, сёй-той з чыноўнікаў, пэўна, пазнаў сам сябе. Памятаю, тады ў мяне выбухнуў тэмперамент, і я шпульнуў ролік у кош для смецця — замест таго, каб прыхаваць яго недзе ў гаражы да лепшых часоў. Зрэшты, гадоў праз пяць я ўсё ж выкарыстаў гэтую песню, зрабіўшы пад яе эпізод у фільме “Камедыянт”.

— Падаецца, гэта сапраўдная катастрофа для творцы: у цябе ўнутры ўжо ўсё сфармавана, і раптам... Ці ёсць у вас рэцэпт, як яе перажыць?

— Рэжысура — гэта справа моцных. Калі ўпершыню закрылі мой фільм, я з месяц ляжаў на канапе ўтыркнуўшыся носам у сцяну. Калі ў другі раз — усяго тыдзень. А калі ў трэці, дык наогул успрыняў гэта даволі спакойна. І сапраўды, літаральна на наступны дзень мне прапанавалі здымаць новы фільм. Пэўна, у кожнага мастака ёсць нешта няздзейсненае. Лічу, так яно і павінна быць. Нешта заўсёды павінна цябе турбаваць. Гэта нармальная сітуацыя. Нават сумна, калі ўсе мары ўвасабляюцца.

— Ці не бянтэжыць вас гэтая залежнасць ад абставінаў, ад чыіхсьці валюнтарысцкіх рашэнняў?

— А ці можа творца ні ад кога не залежыць? Хіба ў тым выпадку, калі ты зачыняешся ў майстэрні сам-насам з халсцінай ды малюеш толькі таму, што проста не можаш не маляваць, зусім не думаючы ні пра якія продажы. Але ў кіно, на жаль, такая схема немагчымая. Ты можаш толькі прыдумаць тэму, напісаць сцэнарый — а далей немінуча трапляеш у залежнасць ад іншых асобаў.

Заканчэнне — **на старонцы 14.**

Імпэт і магія “справы моцных”

28 студзеня народнаму артысту СССР Міхаілу Пташуку споўнілася б 75 гадоў. Напярэдадні памятнай даты “К” перагледзела галоўныя стужкі майстра, каб “убачыць” іх з пазіцыі сённяшняга дня. Сёння, калі глядзіш фільмы Міхаіла Пташука, прыходзіш да высновы, што гэты рэжысёр цалкам мог бы здымаць у Галівудзе. Даць яму адпаведныя магутнасці, бюджэт — і атрымалася б эпічная стужка пра Другую сусветную вайну. У той самы час, гэта быў і рэжысёр шчырай грамадзянскай пазіцыі, якая прасочваецца ў ягоных апошніх фільмах. І шмат у чым ён аказаўся прарокам, адлюстраваўшы ў кіно боль і надлом свайго пакалення.

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 13.)

Як казаў Яўген Глебаў, кіно — гэта калектыўная творчасць, дзе вынік абумоўлены ўнёскам кожнага. І калі нехта пакладзе ў агульную скарбонку замест рубля пятак, прайграюць усе. Што за сэнс, калі аператар будзе ганарыцца сваёй добрай работай у дрэнным фільме?

Ды і вонкавыя фактары таксама ўплываюць, куды без іх? Раней мы залежылі ад цэнзуры — настолькі, што сёння пра некаторыя рэчы і ўспамінаць смешна. Прыкладам, катэгарычна было забаронена здымаць з верхняй кропкі, размешчанай вышэй за другі паверх. Калі з трэцяга зняў — ужо выразалі. Чаму, навошта? Ды гэта яны самі прыдумлялі розныя забароны, каб апраўдаць сваё існаванне. А цяпер у кінематаграфістаў залежнасць іншая — не стае грошай.

Наслухаўшыся, яна ледзь не схапіла мяне за грудкі ды кажа: “Ты проста мусіш усё гэта запісаць!” Так з’явіліся публікацыі на старонках “К”, якія выліліся ў кнігу “Магія белага экрана”. Потым з публікацыі і закадравых гісторый нарадзілася другая — “Магія шматкаляровага экрана”. А літаральна вось-вось павінна выйсці і трэцяя — “Магія чарадзейнага экрана”.

Дарэчы, не так даўно на канале “Беларусь 3” з’явілася мая аўтарская перадача “Люблю і помню”, кожны выпуск якой прыжыцця. Наслухаўшыся, яна ледзь не схапіла мяне за грудкі ды кажа: “Ты проста мусіш усё гэта запісаць!” Так з’явіліся публікацыі на старонках “К”, якія выліліся ў кнігу “Магія белага экрана”. Потым з публікацыі і закадравых гісторый нарадзілася другая — “Магія шматкаляровага экрана”. А літаральна вось-вось павінна выйсці і трэцяя — “Магія чарадзейнага экрана”.

Дарэчы, не так даўно на канале “Беларусь 3” з’явілася мая аўтарская перадача “Люблю і помню”, кожны выпуск якой прысвечаны знакавай постаці беларускай культуры. Мяркуючы па колькасці тэлефанаванняў, якія я атрымаў, гледачоў у яе не бракуе. Запісана пакуль шэсць серый, а заяўкі я падаў на 32. На тэлебачанні мне сказалі: перадача будзе ісці, пакуль Арлоў не выдыхнецца. А Арлоў не выдыхнецца, можаце не сумнявацца!

> *“Гэта знята вельмі паэтычная стужка з назвай “Рой” на выкшталцоную музыку Галіны Гарэлавай: “Вечаровы перазвон кропель у 22 келіхах з дажджавой вадой”.*

— Пытанне, якое я не магу абмінуць — пра вектар развіцця сучаснага беларускага кіно. Калі можна, у двух словах.

— Ведаеце, пытанне — не да мяне. Хай на яго адказваюць крытыкі, мастацтвазнаўцы. Я вельмі прыземлены чалавек, мне цяжка гаварыць на абстрактныя тэмы. Мабыць, ад прыроды не дадзена мне дару абагульнення. Я заўсёды быў сканцэнтраваны на ўласнай працы і тых прагматычных пытаннях, якія з ёю звязаныя. Прыкладам, шукаю цяпер здольнага мантажора для свайго новага фільма. І заклапочаны ў дадзены момант толькі гэтым.

— Новага фільма? Адразу пасля прэм’еры?

— Матэрыял ужо поўнасцю зняты, засталося яго толькі змантаваць. Гэта знята вельмі паэтычная стужка з назвай “Рой” на выкшталцоную музыку Галіны Гарэлавай: “Вечаровы перазвон кропель у 22 келіхах з дажджавой вадой”. Дарэчы, паралельна працую і яшчэ над адной карцінай. Галоўнае ўжо адзнята, застаўся толькі невялічкі “гарнір”. Падрабязнасцяў пакуль раскрываць не буду, усяму свой час. А ў галаве ўжо новая задума — вялікі, папраўдзе сенсацыйны фільм. Спадзяюся, і гэта мне ўдасца ўвасобіць.

— І ці часта вам даводзілася працаваць паралельна над некалькімі стужкамі?

— Што вы, бывалі часіны, калі я працаваў нават “трылінейна” — здымаў не па два, а па тры фільмы адначасова. Планавы аддзел не мог разабрацца, што і да чаго. Але я неяк даваў гэтаму рады. У мяне заўсёды была рэпутацыя сур’ёзнага чалавека, які здатны наладзіць вытворчы працэс. Таму мне і давяралі ды забяспечвалі ўсім неабходным — у тым ліку, высокапрафесійнымі кадрамі. Праўда, не кожны прагнуў са мной працаваць — гэта заўсёды вымагала адказнасці і дысцыпліны. Калі ты прыйшоў на здымкі падпіты, але апаратура працуе, я гэта цярплю. А калі не працуе — адразу шлю тэлеграму ў Мінск і патрабую замяніць такога “спецыяліста”. І яму даводзілася вяртаць ужо прапітыя камандзіровачныя.

> *“Што яшчэ вельмі важна, дык гэта ўмець адсейваць усё другаснае і не вартае ўвагі. Ведаеце, як кіт працэджвае планктон. Каб я не ўмеў гэтага, дык даўно загразнуў бы ў дробязях і нічога б не зрабіў.*

— У вашым актыве дасюль непераўзыдзены ў нас “серыяльны” праект — 33 выпускі “Праклятага ўтульнага дома”. Як вам удалося гэта зрабіць у сярэдзіне 1990-ых — у часы, мякка кажучы, не самыя простыя?

— Гэта быў цуд, а цуды тлумачыць — без сэнсу. Да таго ж, яны маюць схільнасць не паўтарацца. Неяк запусцілі, неяк знялі... Канешне, сёй-той рабіў спробы гэта ўсё прыпыніць: маўляў, хай ён здыме пару пілотных серый, а далей паглядзім. Аднак я меў на гэта свае аргументы: для фільма мы прывялі да ладу бібліятэку Храптовічаў у Шчорсах, падабралі акцёраў, пашылі кожнаму касцюм... Адных гузікаў для салдацкіх мундзіраў спатрэбілася немаведама колькі. А калі гэта ўсё ёсць, ужо і няважна, колькі серый здымаць: дзве альбо сорак.

— Многія наракаюць: мне перашкодзілі, няма фінансавання, нешта пайшло не так... А як вам удалося зрабіць так шмат?

— Нават сам не ведаю. Пэўна, мне пашчасціла сустрэць добрых людзей.

— А зайздрасці не баіцеся?

— Ні кроплі! Я сваім сябрам заўсёды даю параду: не бойцеся зайздроснікаў, наадварот, пладзіце іх! Яны не дадуць вам спачываць на лаўрах.

— І пытанне наастачу. Што б вы параілі таму, хто толькі пачынае сваю кар’еру кінарэжысёра?

— Найперш, вучыцца! Я і пасюль раблю гэта несупынна. Напрыклад, у стваральніка “Зваротнага адліку” Уладзіміра Бокуна я навучыўся ў пачатку фільма паставіць пытанне, а потым праз усю стужку на яго адказваць. Прычым за кожным падвойным дном павінна быць яшчэ адно — не раўнуючы як у Кіа. Вучуся ў мантажораў, з якімі працую, — хаця яны маладзейшыя за маіх унукаў (а старэйшаму з іх ужо 31). Кінематаграфічная моладзь нават думае зусім іначай, чым мы, і гэтае кліпавае мысленне можа быць карысным.

Параіў бы таксама шмат глядзець фільмаў, чытаць кніжак. І як найчасцей мець стасункі з народам, з простымі людзьмі. Бо той мудрасці, якую ты ад іх пачуеш, ні ў адной кніжцы не прачытаеш. А што яшчэ вельмі важна, дык гэта ўмець адсейваць усё другаснае і не вартае ўвагі. Ведаеце, як кіт працэджвае планктон. Каб я не ўмеў гэтага, дык даўно загразнуў бы ў дробязях і нічога б не зрабіў.

К

“Вазьму твой боль”

“Чорны замак Альшанскі”

Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ

“ВАЗЬМУ ТВОЙ БОЛЬ” (1980)

Менавіта пра гэтую стужку па творы Івана Шамякіна Міхаіл Мікалаевіч гаварыў, што яна дапамагла яму ўсвядоміць сваю нішу — псіхалагічнага ваеннага кінематографа. Уладзімір Гасцюхін — галоўны артыст рэжысёра — дакладна трапляе ў вобраз героя, які пакутуе ад злачынства, што засталося без пакарання. У родныя мясціны вяртаецца былы паліцай Шышкевіч, які забіў маці і сястру героя. Працаваць і жыць побач з ім Іван не можа, з іншага боку — Шышкевіч ужо адседзеў свой тэрмін, перад законам ён — чысты.

У фільмах Пташука галоўны канфлікт — гэта сутыкненне характараў. Фон для рэжысёра другасны, і часцей за ўсё “паўсядзённы” — драмы і канфлікты адбываюцца ў пакоях дамоў, у казённых кабінетах, у кабіне машыны... Вайна перажываецца ў душы герояў. І ў “Вазьму твой боль” “спружыну” дзеяння трымаюць акцёры, “выстрэльваючы” ў перадачы ўнутраных драм. Паліцай, паводле Шамякіна, і ў пасляваенны час аказваецца забойцам, што спрашчае яго ўспрыманне. Але душэўныя пакуты Івана паказаны папраўдзе пераканаўча.

“ЧОРНЫ ЗАМАК АЛЬШАНСКІ” (1984)

Аўтарам сцэнарыя быў сам Уладзімір Караткевіч. Стужка пачынаецца з таго, што галоўны герой глядзіць хроніку злачынстваў фашыстаў па тэлевізары. “Прайшло 40 гадоў пасля вайны, — кажа дыктар, — але з кожным годам адкрываюцца ўсё новыя факты фашысцкіх ліхадзействаў. Для іх тэрміну даўнасці няма”. Нягледзячы на тое, што фільм заяўлены ў гісторыка-прыгодніцкім жанры, адпаведныя ўводзіны задаюць паралель паміж злачынствамі князя Альшанскага і XX стагоддзем. Ды і малады шляхціц Валюжыніч — ён жа ў фільме і гісторык Косміч — кідаючы кня-

Рэжысёр з жалезнай хваткай

“Знак бяды”

“Кааператыў “Палітбюро”, або Будзе доўгім развітанне”

“У жніўні 1944-га”

зю ў твар словы пагарды ў час іх сутыкнення, сваімі манерамі нагадвае постаці герояў Вялікай Айчыннай.

Ды ўсё ж галоўны недахоп дзвюхсерыйнай тэлевізійнай карціны — зацягнутаць і хуткая, нават імклівая, а таму і скамечаная развязка. Уражваюць сцэны смяротнага пакарання Валюжыніча і Гражыны, вяртанне памяці і смерць Лапатухі, аднак большую частку дзеяння камера прыкаваная да твару Косміча. Пэўнае напаўненне асяродка героя дэталямі не пазбаўляе ад адчування абмежаванасці ў выбары візуальных сродкаў. Ды і беларускасць паказаная зусім умоўна — у фільме на беларускай мове не гаворыць нават філолаг Змагіцель.

У сваім рамане Уладзімір Караткевіч абірае форму дэтэктыва, каб распавесці пра гісторыю Беларусі — яна, па-сутнасці, і з'яўляецца тут галоўнай гераіняй, неабходным парталам, што вядзе да сучаснасці і да нявыкрытых злачынстваў. Трактоўка гэтай гісторыі Міхаіла Пташука — больш прыземленая. Рэжысёр схоплівае дух твора Караткевіча, выбудовае сувязь паміж XVII і XX стагоддзямі, але ў візуальным плане дазваляе сабе няшмат.

“ЗНАК БЯДЫ” (1986)

Адна з наймацнейшых экранізацый Васіля Быкава. Бліскучы бенефіс Ніны Русланавай, якая грае Сцепаніду, ды Генадзя Гарбука ў ролі Петрака. Міхаіл Пташук у гэтай стужцы дэманструе выбітную рэжысёрскую хватку, калі складаныя псіхалагічныя калізіі сюжэта перадаюцца з вялікай увагай і пієтэтам. Першая серыя фільма глядзіцца на адным дыханні. Хаця гэта цяжкая для псіхікі карціна, дзе вайна паказваецца як уварванне не проста ў дом звычайнага працаўніка, а ў яго асабісты свет, свядомасць, становячыся квінтэсэнцыяй чалавечай несправядлівасці.

Карціна атрымала галоўны прыз на міжнародным кінафестывалі ў Сопаце і міжнародную прэмію BBC за найлепшую замежную стужку. Кажуць, што ў англійскім пракаце яна абышла нават “Узвод” Олівера Стоўна. І гэта падаецца цалкам магчымым.

“КААПЕРАТЫЎ “ПАЛІТБЮРО”, АБО БУДЗЕ ДОЎГІМ РАЗВІТАННЕ” (1992)

Гратэскны фарс, які ператвараецца ў трагедыю. Гэты фільм, як і зроблены напярэдадні “Наш бронецягнік”, раскрываюць Міхаіла Пташука ў іпастасі аўтара-даследчыка, і, у пэўным сэнсе, дысідэнта. Ёсць гісторыя пра тое, што “Наш бронецягнік”, у якім падымаецца тэма ГУЛАГа, выпусцілі на экраны праз рукі Міхаіла Гарбачова. Генсеку ЦК КПСС даслалі карціну разам з іншымі замежнымі стужкамі на дачу ў Фарос. Міхаіл Сяргеевіч адразу пасля прагляду патэлефанаваў старшыні Дзяржкамітэта СССР па кінематаграфіі і даў дабро на запуск кіно ў пракат, пазначыўшы фільм першым перабудоўчым кінатворам.

Як бы там ні было, але “Наш бронецягнік” па сцэнарыі Яўгена Грыгор'ева з удзелам Уладзіміра Гасцюхіна, Міхаіла Ульянава, Аляксандра Філіпенкі і сёння глядзіцца вельмі смелым кіно. “Кааператыў “Палітбюро”, дзе галоўную ролю іграе Аляксей Пятрэнка, лагічна працягвае думкі рэжысёра пра тое, кім з'яўлялася савецкая ўлада для людзей, і куды, урэшце, яна прывяла народ.

У гэтых дзвюх стужках майстра выкарыстоўвае фатаграфію як сродак пагружэння ў гісторыю персанажа (“Наш бронецягнік”) або метафару спалучэння мінулага і сучаснага (“Кааператыў “Палітбюро”). Апошняя работа майстра невыпадкова сабрала пяць узнагарод на міжнародных кінафестывалях: у фільме ёсць пераканаўчы вобраз, моцны сцэнарый і брутальная развязка ў духу ліхіх 1990-х.

“У ЖНІЎНІ 1944-ГА” (2000)

Шырокавядомая сёння і прызнаная адной з найлепшых ваенных карцін “У жніўні 1944-га” падчас свайго стварэння перажыла нямала выпрабаванняў. Аўтар сцэнарыя — Уладзімір Багамолаў, па рамане якога “Момант ісціны” стваралася карціна, з-за рознагалоссяў з рэжысёрам зняў сваё імя з фінальных цітраў. Шмат канфліктаў было і з прадзюсарамі карціны. Фільм выратавала толькі асабістае ўмяшальніцтва Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

Што ў выніку? Шэсць намінацый на Нацыянальную кінапрэмію Расіі “Ніка”, адны з найвядомых роляў Яўгена Міронава і Уладзіслава Галкіна (які атрымаў “Ніку” ў намінацыі “Адкрыццё года”), любоў гледачоў. Стужку расцягнулі на цытаты, і многія рэжысёры сёння намагаюцца дасягнуць таго саспенсу, якім з першых кадраў заварожвае карціна. Міхаілу Пташуку ў фільме ўдалося выкарыстаць аўтарскі досвед рэалістычнай драмы ў сучасным фармаце. Па сутнасці, рэжысёр злучыў псіхалагічны трылер і ваенную драму — і атрыманы мікс аказаўся настолькі арганічным і ўдалым, што ідэалагічны бок сышоў на другі ці нават трэці план.

“Альбо шэсць “Нік”, альбо — ніводнай”, — такімі былі словы Міхаіла Мікалаевіча напярэдадні яго паездкі ў Маскву. Як вядома, рэжысёр загінуў па дарозе на цырымонію кінапрэміі.

Міхаіл Пташук — рэжысёр з моцнай прафесійнай і асабістай хваткай, які браўся за складаныя тэмы і ставіў перад сваім пакаленнем складаныя пытанні. Такім ён успрымаецца сёння ў сваіх кінатворах, якія з'яўляюцца неацэннай спадчынай беларускага кіно.

К

Так атрымалася, што газета “Культура” сталася тым выданнем, якое ўзяло апошняе інтэрв'ю ў майстра перад яго ракавой паездкай у Маскву. Карыстаючыся нагодай, даем вытрымкі з гутаркі, што адбылася ў красавіку 2002 года.

Пра дзяцінства

— Я вырас у той пасляваенны час, калі ў кожнага чалавека на слыху было толькі адно слова — вайна. Маё пакаленне проста ўсмактала гэта слова, як кажуць, з малаком маці. І як не ўсмактаць — я, напрыклад, вырас у вёсцы, дзе з аднаго боку нашага дома жыў сусед, які распісаўся на сцяне Рэйхстага і памёр ад галечы, да таго ж калекам, а з другога боку — жанчына, у якой родныя былі паліцаямі. Вось вобраз майго дзяцінства і вобраз Беларусі: ваеннай і пасляваеннай. І ўсе выдатна жылі побач, быццам і не было вайны, быццам ніхто не дайшоў да Рэйхстага, ніхто не быў у паліцаях. І мы, дзеці гэтых людзей, сябравалі паміж сабой. Але не дай Бог курыцы той суседкі залезці на градку да маёй бабкі! Тады яна крычала: “Сволач паліцэйская!” Ускалыхвалася памяць ад самай маленькай дэталі. Так прайшло маё дзяцінства.

Пра апошні праект

— Я і сапраўды думаў: як можна праз 60 гадоў паказаць вайну? Што можна ў гэтай тэме зрабіць новага? Масавымі сцэнамі ўжо нікога не здзівіш, і ў “Выратаваць шарагоўца Раяна”, і ў “Сталінградзе” — проста выдатныя батальныя сцэны. Якая ідэя здольная аб'яднаць два народы: амерыканскі і беларускі? І прыдумаў такое. Амерыканская жанчына апынулася да 1939 года ў Іспаніі альбо нейкай іншай краіне Еўропы, дзе сустрэла вайну. І яна бяжыць ад вайны, а вайна даганяе яе. Але ўцякаючы ад вайны, яна выратоўвае дзяцей: і французскіх, і іспанскіх, і польскіх, і нямецкіх, і яўрэйскіх... І, нарэшце, трапляе ў Беларусь. А там яе падбірае і дапамагае ёй беларуская жанчына, у якой самой пяцёра дзяцей.

Як расказвала мне бабка, у часы вайны людзей, якія былі ў вялікай небяспецы, хавалі ў ямы. Пад гумнамі рылі ямы і хавалі туды бедачын. Гэтыя людзі маглі жыць толькі ноччу. Так здарылася і з нашай амерыканкай. І вось, дзве жанчыны вядуць гэтае жудаснае начное жыццё. Тая амерыканка, якая ў вочы не бачыла плуга і барану, спазнае іншы свет. Яна разам з нашай беларускай працуе, вырошчвае хлеб... дзеля дзяцей. Вось такая ідэя ў мяне ўзнікла. Я буду здымаць карціну для амерыканцаў, але мне хацелася б падкрэсліць і мае карані.

Пра эвалюцыю ваеннага кіно

— Я прааналізаваў усю савецкую літаратуру аб вайне: Бакланава, Гросмана, Астаф'ева... Усе пісалі баталіі, эпапеі аб вайне, а Быкаў пісаў апавяданні: ён, яна — і вайна ў іх душах. І ў гэтай камернасці, “лакальнасці” і ёсць эвалюцыя сённяшняга кіно. Я ў палоне быкаўскай літаратуры ўжо шмат гадоў, і мне хочацца, каб у маёй новай карціне была гэткая Сцепаніда...

Пра “Партызанфільм” і ваеннае пакаленне

— У тыя гады, калі гэты ярлык быў начэплены, ён утрымліваў долю іроніі. Маўляў, “Беларусьфільм” нічога не здымае, акрамя вайны і партызан. Але я лічу, што лепшыя нашы карціны менавіта па гэтай тэме — што вельмі натуральна, бо ў нас загінуў кожны чацвёрты. Аднак сёння з'яўляецца вобраз новага героя, чымсьці падобнага да сучаснага салдата, які ваяваў у цяперашніх гарачых кропках.

Тое пакаленне, якое ўзяло вайну на сябе, мужнае пакаленне, людзі, што прайшлі лагеры, фронт, — яны вельмі жывучыя. Яны пражылі ў галечы, у працы, але захавалі дух. Той дух, які выратаваў іх там — ён застаўся ў іх і сёння, і яны жывуць за кошт гэтага духу.

Кожны новы фільм аб вайне спраектаваны на ўсе войны — і мінулыя, і сучасныя. Напрыклад, у “Браце” мне падабалася адна ідэя. Людзі, якія вярнуліся “з таго свету”, маюць павышанае пачуццё справядлівасці. Тут яны гулялі, пілі, а там дзялілі адну лусту хлеба. Гэтыя людзі вяртаюцца і бачаць, што тут не так, як на вайне, і яны прагнуць той “ваеннай” справядлівасці.

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.";
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.";
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.";
■ "Мастацтва краін Усходу XIV — XX стст.".
Выставы:
■ Выставачны праект **"Святыя непадзеленай Царквы"** — да 20 лютага.
■ Юбілейная выстава народнага мастака Рэспублікі Беларусь Віктара Грамыкі (прымеркавана да 95-годдзя мастака) — да 2 лютага.
■ Выстава **"Паэтыка пейзажаў Сямёна Дамарада"** — да 11 лютага.
■ Выстава Вольгі Угрыновіч **"У сутворчасці з прыродай"** (фарфор, жывапіс) — да 4 сакавіка ў арт-кафэ музея.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстава акварэлі Ларысы Стрыжак і Наталлі Харольскай **"Мы любім кветкі..."** — да 15 лютага.
■ Літаратурна-музычны вечар **"Залаты век лютні"** — 30 студзеня. Пачатак а 19-й.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Жаночы сусвет"** — да 11 сакавіка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ Бестэрміновая акцыя **"Адзіны білет"**, якая дазваляе мінчанам і гасцям сталіцы наведаць музей і яго шэсць філіялаў, набыўшы ўсяго адзін білет у любым з іх.
■ Аўтарскі праект Ахрэма Белабровіка **VKL3D**.
■ Акцыя **"Вольнае пяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
Выставы:
■ Выстава **"Беларусь: адраджэнне духоўнасці"**.
■ Выстава **"Ад рымскага дэнарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава **"Great Britain"** (сумесны адукацыйны праект мастачкі Антаніны Петрыкоўскай і музея) — з 31 студзеня да 18 лютага.
■ Выстава твораў Настассі Балыш **"Таямніцы святла"** — да 17 лютага ў музейнай прасторы "Галерэя".
■ Выставачны праект **"АРТефакты игры"** — да 28 студзеня.

Філіялы музея
ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
■ **Абноўленая экспазіцыя**, прымеркаваная да 100–годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі (залы дапоўненыя новымі прадметамі амаль з усіх фондавых калекцый музея).
■ Экспазіцыйны праект **"Мінск 1917"**, прысвечаны гісторыі горада ў рэвалюцыйны 1917 год — да 11 сакавіка.
■ Аўтарская выстава фатаграфіі А.Ліннэманна **"13-е Акно"**.

МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 11.
■ Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 06 33.
Экспазіцыі:
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ Выстава **"Жывыя цмокі"** — да 25 лютага.
г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон").
Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Выстава **"Сафары парк"**.
■ Атракцыён **"Стужачны лабірынт"**.
■ Атракцыён **"Лазерны квэст"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях"; "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст."; "Беларуская музычная культура XX ст."; "Тэатральная культура Беларусі XX ст.".

У МІНСКУ ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" МОЖНА НАБЫЦЬ У НАСТУПНЫХ КРОПКАХ:

МАГАЗІНЫ "БЕЛСАЮЗДРУК"
● **Падземны пераход ст.м. "Пятроўшчына".**
● **Падземны пераход ст.м. "Плошча Перамогі".**
● **Праспект Незалежнасці, 44.**
● **Вуліца Валадарскага, 16.**

КІЁСКІ "БЕЛСАЮЗДРУК"
● **ст.м. "Няміга", вул. М. Багдановіча.**
● **Праспект Пераможцаў, 5.**
● **Вуліца Рабкораўская, 17.**
● **Праспект Незалежнасці,168, В.**
● **Вуліца Лабанка, 2.**

■ Выстава **"Легенда беларускай оперы"** (да 90–годдзя з дня нараджэння рэжысёра оперы, народнага артыста Беларусі С.А. Штэйна) — да 11 лютага.

ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Персанальная выстава жывапісу Сняжаны Віцецкай **"Час шукаць"** — да 28 студзеня.
Майстар-класы:
■ Музейныя заняткі **"Тэатральная лялька"** для дзяцей 5+.
■ Інтэрактыўныя музейныя заняткі **"Асновы акцёрскага майстэрства"** для дзяцей ад 5 да 10 гадоў.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ **"Асаблівая фатаграфія"** (першая выстава Секцыі аналагавай фатаграфіі Беларускага аб'яднання фатографаў) — да 18 лютага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе: пн. — выхадны, аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й, сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Часовая экспазіцыя **"У баях за Айчыну. Дзейнасць спецгруп НКУС-НКДБ СССР-БССР на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. 1941 — 1944 гг."** — да 31 студзеня.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; +37529 551 80 51, + 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Гарнітурная лялька і кабінетная бронзавая скульптура"** з калекцыі Мікалая і Алены Байрачных — да 4 лютага.
■ Гістарычны квэст **"Таямніцы і загадкі палаца Радзівілаў"**. Па папярэдніх заяўках.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
Вул. Гейсіка, 1.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Дуэт"** з калекцый майстроў выцінанкі Алены Шаліма і Наталлі Гамаюнавай.
Ратуша Вул. Савецкая, 3.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Квэст **"Выхадкі старога захавальніка"**. Па папярэдніх заяўках.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Міжнародная перасоўная выстава **"Лагер смерці Трасцянец. Гісторыя і памяць"** — да 25 лютага.
■ Тэатралізаваная экскурсія **"І зноў ажываюць паданні"**.
■ Экскурсія з элементамі дэгустацыі **"У госці да Пане Каханку"**.
■ Дзіцячая тэатралізаваная экскурсія **"Чароўная гісторыя ў Мірскім замку"**.
■ Музейныя заняткі.
■ Музейная фотапляцоўка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Экспазіцыя **"Склеп"** на сядзібе Якуба Коласа.
■ Тэматычныя экскурсіі і лекцыйныя заняткі.
■ Тэатралізаваныя прадстаўленні паводле беларускіх народных казак.
■ Музейныя майстар-класы і заняткі.
■ Мультымедыйны комплекс **"Чалавек. Асоба. Час"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
■ Інтэрактыўныя праграмы для сямейных наведвальнікаў, квэст-гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"**.
■ Выстава **"Yiwarra Kuju — маршрут Кэнінга: мастацтва абарыгенаў пустыні Заходняй Аўстраліі"** — да 14 лютага.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска
ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава жывапісу Сілвы Лінартэ (Латвія) **"Адлюстраванне"** — да 4 лютага.
■ Выстава **"Леў Барадулін. Легенда спартыўнай фатаграфіі"** — да 25 лютага.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.

МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 8. Тэл.: 321 24 30.
■ **"Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж"** (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.

ЭКСПАЗІЦЫЯ "МІНСКАЯ КОННАЯ ЧЫГУНКА"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6.
■ Экспазіцыя складаецца з некалькіх раздзелаў, якія распавядаюць пра жыццё Мінска 1890 — 1920-х гг.

АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава мастацкага тэкстылю і касцюма **"Гіперсувязі"** студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — да 25 лютага.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"Гомель і гамяльчане напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны"** (выставачная зала).
■ Выстава **"Бітва матораў"** (хол музея).

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзем пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**

НАВАГРУДСКІ ГІСТОРЫКА-КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ
г.Навагрудак, вул. Гродзенская, 2. тэл. (8-01597) 2 14 70.
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Гісторыя Навагрудчыны са старажытных часоў да Вялікай Айчыннай вайны"**.
г.Навагрудак, вул.Мінская, 64-66.
■ Экспазіцыя: **"Музей яўрэйскага супраціўлення ў Навагрудку"**.

ДОМ-МУЗЕЙ АДАМА МІЦКЕВІЧА Ў НАВАГРУДКУ
г. Навагрудак, вул. Леніна,1.
Тэл.: (8-01597) 2 43 40 (каса).
■ Пастаянная экспазіцыя: **"Жыццё і творчасць Адама Міцкевіча"**.
■ Пастаянныя выставы: **"Святло кухні Міцкевічаў", "Малюнкі сельскага жыцця", "Пан Тадэвуш" праз час і народы"**.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **27 студзеня — "Рэквіем"** Дж.Вердзі. Дырыжор — Амос Тальмон (Ізраіль).
■ **28 — "Доктар Айбаліт"** (опера ў 2-х дзеях) М.Марозавай. Пачатак аб 11-й.
■ **28 — "Жызэль, або Вілісы"** (балет у 2-х дзеях) А.Адана. Пачатак а 18-й.
■ **30 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.
■ **31 — "Спартак"** (балет у 3-х дзеях) А.Хачатурана.
■ **31 — "Лісты да незнаёмкі"** (канцэрт лаўрэата міжнародных конкурсаў Тацяны Гаўрылавай). Камерная зала імя Л.П.Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **1 лютага — "Сельскі гонар"** (опера ў 2-х дзеях) П.Масканы.
■ **2 — "Жарсці (Рагнеда)"** (балет у 2-х дзеях). Да 80-годдзя народнага артыста Беларусі Андрэя Мдзівані.
■ **3 — "Тры парсючкі"** (балет у 2-х дзеях) С.Кібіравай. Пачатак а 12-й.
■ **3 — "Паяцы"** (опера ў 2-х дзеях) Р.Леанкавала.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мяснікова, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **27 студзеня — "Спячая прыгажуня"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Прэм'ера. Пачатак аб 11-й.
■ **27 — "Містар Ікс"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана. Пачатак а 18-й.
■ **28 — "Джунглі"** (музычная казка для дзяцей). Прэм'ера. Пачатак аб 11-й.
■ **28 — "Жаніхі"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Дунаеўскага. Прэм'ера. Пачатак а 18-й.
■ **29 — "Вяселле ў стылі рэтра"** (лірычная камедыя ў адной дзеі) А.Журбіна. Прэм'ера.
■ **30 — "Цыганскі барон"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Штрауса.
■ **1 лютага — "Лебядзінае возера"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **2 — "Джэйн Эйр"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **3 — "Прыгоды Кая і Герды"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) Г.Шайдулавай. Пачатак аб 11-й.
■ **3 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** (мюзікл у 2-х дзеях) А.Хадоскі. Пачатак а 18-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44.
Тэл./факс: 334 60 08.
■ **27 студзеня — "Два чароўныя парасоны"** (казка для дзяцей і дарослых) Г.Х.Андэрсена. Пачатак аб 11-й.
■ **27 — "Адамавы жарты"** (камедыя) С.Навуменка.
■ **28 — "Бетон"** (візуальная паэзія) Я.Карняга. Прэм'ера.
■ **30 — "Раскіданае гняздо"** (народная трагедыя) Янкі Купалы.
■ **31 студзеня, 1 лютага — "Кар'ера доктара Рауса"** (гістарычна недакладная трагікамедыя) В.Марціновіча. Прэм'ера.
■ **2 — "Пакуты ад здаровага сэнсу"** (камічная прыпавесць) С.Рубэ. Прэм'ера.
■ **3 — "А мне не сорамна!.."** (больш чым казка) Л.Усцінава. Пачатак аб 11-й.
■ **3 — "Тры Жызэлі"** (драма) А.Курэйчыка.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **27 студзеня — "Умка"** (кранальная гісторыя ў адной дзеі) Ю.Якаўлева.
■ **28 — "Мой Надзейны Сябра: 101"** (вельмі небяспечная гісторыя) В.Стацэні. Пачатак спектакляў аб 11-й.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Фотавыстава Аляксандра Ласмінскага **"Сэрца зямлі маёй"** — да 30 студзеня.
■ Выстава керамікі беларускіх майстроў **"Між рукамі і полымем"** — да 8 лютага.

УВАГА!
ТУТ МАГЛА БЫЦЬ ВАША АФІША!
Звяртайцеся:
+375 17 286 07 97,
+375 17 334 57 41 (факс)
kultura@tut.by